WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

3 ВЕРАСНЯ 2011 г. СУБОТА № 168 (27032)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

**Удзельнікам і гасцям урачыстасцяў Дня беларускага пісьменства**

***Паважаныя сябры!***

***Сардэчна віншую вас з Днём беларускага пісьменства, які адзначаецца сёлета на гасціннай Брэсцкай зямлі, у Ганцавічах.***

***З года ў год гэта свята робіцца знакавай падзеяй культурнага жыцця краіны, сведчыць пра багацце гістарычнай спадчыны і духоўных традыцый нашага горада. Многія стагоддзі айчынная кніжнасць замацоўвае вечныя ідэалы дабра і справядлівасці, з'яўляецца жыватворнай крыніцай мудрасці і ведаў.***

***Ганцаўшчына непарыўна звязана з жыццём і творчасцю выдатнага песняра Якуба Коласа. Святкаванне Дня пісьменства ў гэтых памятных мясцінах яшчэ раз звяртае нас да каштоўнасцяў, якія занатаваны ў яго кнігах. І галоўныя з іх — павага да простага чалавека, маральная чысціня, высакароднасць і самаадданая любоў да роднай зямлі.***

***Менавіта на такім падмурку і будуецца ідэалогія сучаснай Беларусі. Таму наша дзяржава будзе заўсёды спрыяць развіццю нацыянальнай культуры і падтрымліваць творцаў, якія з'яўляюцца сапраўднымі патрыётамі сваёй Радзімы.***

***Шчыра жадаю ўсім удзельнікам і гасцям урачыстых мерапрыемстваў шчасця, згоды, плённай працы і дабрабыту.***

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



# ЗЯМЛЯ ЖЫВОГА СЛОВА

**Не ў крыўду Ганцавічам сказана, але да гэтага часу ў нас не ўсе ведалі, што ёсць такі райцэнтр. Вядома, калі ў краіне налічваецца ажно 118 раёнаў і калі табе не даводзіцца шмат калясіць, можна і не ведаць той ці іншы адміністрацыйны цэнтр. Тым больш калі ён зусім невялікі па колькасці вуліц і паверхаў новабудоўляў і ў ім не захаваўся шэдэўр архітэктуры эпохі барока ці класіцызму. А балотамі і лясамі, якія вакол Ганцавіч, да нядаўняга часу ў нас цікавіліся далёка не ўсе.**

СТАР. 3



**Вёска Востраў. Старэйшая жыхарка Лідзія РУДКОЎСКАЯ дзеліцца ўспамінамі пра свайго брата — паэта Міхася Рудкоўскага з вучнямі і настаўніцай вясковай школы.**



**Вёска Люсіна. Памятны камень на месцы народнага вучылішча, у якім у 1902—1904 гадах вучыў дзяцей будучы народны паэт Беларусі Якуб Колас.**

Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.



**Вёска Лактышы. Яе жыхар Іосіф ЛЕНКАВЕЦ абуджае наваколле малінавым звонам-вестуном: на ганцаўскай зямлі свята!**

# САГРЭТЫЯ СВЯТАМ

**Урачыстае адкрыццё Дня беларускага пісьменства адбудзецца заўтра — 4 верасня, але святкаванне ў Ганцавічах пачынаецца сёння. А за два дні да свята я наведаў Ганцавічы.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзіўна, але мне падалося, што райцэнтр заўсёды быў такім прыгожым і сучасным. Безумоўна, гэта не так, хоць кіраўнік раёна Уладзімір Столяр за адзінаццаць гадоў здолеў максімальна навесці ў горадзе парадак. Але, найперш, гэта былі падмеценыя вуліцы, пафарбаваныя фасады дамоў, а сучаснага бляску не было, бо патрэбны вялікія грошы.

Прыгожыя алеі і альтанкі ўжо прыйшліся даспадобы людзям, і сквер аблюбавалі мамы з дзецьмі. Будуць устаноўлены не толькі памятныя знакі, але і помнік Якубу Коласу: пасля Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі будучы пісьменнік два гады адпрацаваў на Ганцаўшчыне.

Радуе і тое, што амаль усе надпісы і шыльды ў цэнтры Ганцавічаў напісаны па-беларуску. Сапраўднае Свята **беларускага** пісьменства.

Зранку ў кабінеце старшыні райвыканкама праходзіла нарада, а затым Уладзімір Столяр даў для «Звязды» невялікае інтэрв'ю.

**— Нельга сказаць, што Ганцавічы былі забыты «ўсім светам». Але раён месціцца ў глыбіні Палесся, і таму ён увесь час заставаўся на перыферыі, а тут вырашылі ў Ганцавічах правесці Дзень беларускага пісьменства. Чым да сябе прыцягнулі ўвагу? Хто дапамог?**

*— Калі б нас не падтрымаў старшыня аблвыканкама Канстанцін Сумар, то, напэўна, свята абмінула б Ганцавічы. А вось наконт таго, чым наш горад прыцягнуў увагу, то, найперш, сваёй самабытнасцю. Раней Дні беларускага пісьменства праводзіліся ў старажытных гарадах, а Ганцавічы размянялі толькі другое стагоддзе, але мы здолелі захаваць набыткі мінулага. Нашы дзеці займаюцца ў Доме рамёстваў, Цэнтры дзіцячай і юначай творчасці, і ў іх ёсць магчымасць на творах народнага мастацтва сваіх продкаў вучыцца і нешта пераймаць. А колькі паэтаў дала Беларусі наша зямля! Культуру нельга драбіць на часткі. Народная творчасць, паэзія... — гэта ўсё адно цэлае.*

СТАР. 3

# МАТРЫЦА САЦАБАРОНЫ

**БЕЛАРУСЬ захоўвае сацыяльна арыентаваную палітыку, нягледзячы на складаныя эканамічныя ўмовы. На нарадзе па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўказаў на неабходнасць прыняцця шэрагу мер па сацыяльнай абароне малазабяспечаных слаёў насельніцтва і работнікаў бюджэтнай сферы. Аб тым, якія захады будуць зроблены ў гэтым напрамку, у інтэрв'ю БЕЛТА расказаў намеснік прэм'ер-міністра Анатоль ТОЗІК.**

***— Анатоль Апанасавіч, 30 жніўня на нарадзе ў Прэзідэнта было даручана аказаць бюджэтнікам і пенсіянерам разавую дапамогу ў памеры Br500 тыс. Гэта сума будзе выплачвацца ўсім або ў залежнасці ад узроўню даходу кожнага канкрэтнага чалавека?***

— Справа ў тым, што ўзровень даходу вызначыць даволі складана, таму было прынята рашэнне аказаць падтрымку ўсім бюджэтнікам і пенсіянерам. Спачатку будзе выплата ў памеры Br500 тыс. У далейшым узмацненне сацпадтрымкі пенсіянераў будзе ажыццяўляцца праз павелічэнне памераў пенсій (дата вызначана ўказам — з 1 лістапада гэтага года). Што датычыцца бюджэтнікаў, то іх даходы крыху ўзрастуць пасля павышэння тарыфнай стаўкі першага разраду (магчыма, таксама з 1 лістапада 2011 года). Да гэтага часу будзе праводзіцца індэксацыя ў адпаведнасці з інфляцыяй.

***— А ў чым сутнасць матрыцы сацабароны, аб выпрацоўцы якой гаварыў прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч?***



Фота БЕЛТА.

— Сутнасць яе ў тым, каб у пытаннях сацыяльнай абароны насельніцтва прымяняць сістэмны мэтавы падыход. У матрыцу ўваходзіць аказанне дапамогі пенсіянерам, студэнтам, інвалідам (у краіне налічваецца 2,5 млн пенсіянераў, каля 450 тыс. студэнтаў і 504 тыс. інвалідаў). Таксама трэба аказаць падтрымку сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, маці, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці, і тым людзям, якія даглядаюць інвалідаў першай групы. Не выпусціць з-пад увагі ніводнай катэгорыі насельніцтва, якая мае патрэбу ў падтрымцы, — вось галоўная задача матрыцы.

Але пры гэтым заўважу, што важна не перабраць. Хачу звярнуць увагу на тое, што людзі павінны не толькі спадзявацца на дапамогу дзяржавы, але і рабіць самастойныя захады для паляпшэння свайго матэрыяльнага становішча. Паколькі ёсць такія, хто, напрыклад, не дапамагае сваім хворым бацькам. Цяпер мы пераважна ўздзейнічаем на іх словамі, заклікаем да сумлення. А потым, магчыма, будзем звяртацца і да адміністрацыйных мер.

Зразумела, у краіне дзейнічаюць агульныя прынцыпы. Аднак за імі трэба бачыць канкрэтнага чалавека. Сельсаветы, раённыя выканаўчыя камітэты, органы па працы, занятасці і сацабароне павінны ведаць кожнага, каму неабходна дапамога.

***— Анатоль Апанасавіч, якія меры плануецца прыняць для падтрымкі студэнтаў?***

— Будзе праводзіцца індэксацыя стыпендый, як і індэксацыя даходаў бюджэтнікаў. Мяркую, што ў бліжэйшы час будзе падпісаны ўказ, які будзе рэгуляваць памер стыпендый. У бліжэйшыя дні ўрад па даручэнні кіраўніка дзяржавы падрыхтуе праект гэтага дакумента.

***— Ці разглядаецца пытанне аб павышэнні памеру матэрыяльнай дапамогі іншагароднім студэнтам, якія здымаюць жыллё? І колькі ў гэтым навучальным годзе будзе каштаваць пражыванне ў студэнцкіх інтэрнатах?***

— Прынята рашэнне зрабіць плату за пражыванне ў студэнцкім інтэрнаце дыферэнцаванай. Згадзіцеся, што плата Br15,7 тыс. за пражыванне ў камфартабельным пяцімесным блоку з двух пакояў з кухняй і санвузлом проста нелагічная. Цяпер такія віп-умовы будуць каштаваць тры базавыя велічыні — Br105 тыс.

Справядліва аплачваць пражыванне ў інтэрнаце ў адпаведнасці з узроўнем яго камфартабельнасці. Так, пражыванне ў інтэрнатах з нізкім узроўнем камфартабельнасці будзе каштаваць студэнту адну базавую велічыню (Br35 тыс.), у інтэрнатах другога ўзроўню — дзве базавыя велічыні, трэцяга — тры базавыя. Атрыманыя сродкі будуць паступаць у распараджэнне вышэйшай навучальнай установы, і за іх кошт плануецца аказваць дапамогу тым студэнтам, якія вымушаны здымаць жыллё з-за няхваткі месцаў у інтэрнатах.

Аднак студэнты павінны разлічваць не толькі на дапамогу ВНУ або дзяржавы, але і імкнуцца зарабляць самім. У еўрапейскіх універсітэтах студэнты працуюць дворнікамі, прыбіральшчыкамі, пасудамыйкамі, афіцыянтамі. У нас таксама ёсць магчымасць прадастаўляць студэнтам рабочыя месцы, якія не патрабуюць спецыяльнай кваліфікацыі. Я прасіў рэктараў, каб у фае кожнай ВНУ былі вывешаны спісы вакансій для студэнтаў.

Дзяржава, вядома ж, прадоўжыць аказваць падтрымку малазабяспечаным студэнтам, але нельга разлічваць толькі на гэту дапамогу.

СТАР. 2

## Надвор'е

### У НЯДЗЕЛЮ СОНЕЧНА І ЦЁПЛА, А НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ ЗНОЎ ДАЖДЖЫ

**Яшчэ і ў суботу частка тэрыторыі Беларусі застанецца пад уплывам халаднаватага вільготнага паветра, якое трапіла да нас з боку Балтыйскага мора. Толькі паўднёва-заходні рэгіён Беларусі трапіць у зону павышанага ціску і надвор'е палепшыцца, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

У нядзелю Беларусь трапіць у арбіту ўплыву скандынаўскага антыцыклону, таму атмасферны ціск павялічыцца і ўсталюецца сонечнае надвор'е. Удзень месцамі па Магілёўскай і ўсходзе Віцебскай абласцей магчымы невялікі дождж. Уначы тэмпература паветра знізіцца да 5—10, а ўдзень сонейка прыгрэе да плюс 16—22, у Брэсцкай вобласці да 25 цяпла. Цёплае і сонечнае надвор'е захаваецца і ў панядзелак, удзень будзе 17—23, на поўдні да 25. Цудоўнае, без ападкаў надвор'е будзе ў аўторак. Аднак удзень месцамі ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях магчымы кароткачасовы дождж і навальніца. Уначы на аўторак 4—11, удзень — 17—25. Прагназуецца, што ў сярэдзіне наступнага тыдня атмасферны фронт з боку Заходняй Еўропы прынясе ў Беларусь чарговую порцыю ўжо восеньскіх дажджоў, магчымыя навальніцы. Тэмпература ўдзень 15—22. Пры такім надвор'і ў Беларусі пачынаецца сезон грыбоў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Эксклюзіў

# ПРЫ ВЫДАЧЫ ЛЬГОТНЫХ КРЭДЫТАЎ БУДЗЕ ЎЛІЧВАЦЦА НАЯЎНАСЦЬ ЖЫЛЛЯ НА ЎСЁЙ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

**АБ перспектывах змянення ўмоў жыллёвага будаўніцтва ў гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» расказвае начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ.**

***— Сёння ў вашым ведамстве распрацоўваецца новая канцэпцыя па прадастаўленні льготных крэдытаў пэўным катэгорыям насельніцтва, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Разам з тым, днямі пачаў дзейнічаць указ кіраўніка дзяржавы, дзе зніжаны крытэрый патрэбнасці ў жыллі ў Мінску з 15 да 10 квадратных метраў агульнай плошчы на чалавека. Раней у Беларусі, ды і ў Мінску, ільготны крэдыт давалі пад будаўніцтва кватэры ў разліку 20 метраў на чалавека. Гэты нарматыў цяпер будзе неяк карэкціравацца?***

— Зараз норма льготнага крэдытавання ў памеры 20 метраў на чалавека ў новай канцэпцыі захоўваецца.

Аднак ёсць прапанова змяніць яе менавіта ў сталіцы нашай краіны ў сувязі з новымі ўмовамі прыняцця грамадзян на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Спецыялісты разглядаюць варыянт па памяншэнні нормы плошчы кватэры, на якую будзе давацца льготны крэдыт, да 15 метраў на чалавека. Па рэспубліцы норма застаецца 20 квадратных метраў на чалавека, а ў Мінску, магчыма, будзе 15 м кв. Зараз такі праект дакумента па змяненні крэдытнага нарматыву актыўна абмяркоўваецца спецыялістамі і кіраўнікамі самых розных узроўняў. Пытанне сацыяльнае і патрабуе асаблівай увагі. Ужо сёння існуе мноства варыянтаў такога дакумента.

***— Бадай, самае галоўнае пытанне, якое цікавіць нашых чытачоў, тычыцца катэгорый насельніцтва, што падпадаюць пад ільготнае жыллёвае крэдытаванне. Вядома, што да канца года сёлета на льготныя крэдыты могуць разлічваць толькі шматдзетныя сем'і, а таксама жыхары населеных пунктаў з колькасцю насельніцтва да 50 тысяч чалавек і ў гарадах Кобрын, Слуцк, Рэчыца і Светлагорск.***

СТАР. 2

**ДА ВЕДАМА**

- ✓ **Норму плошчы жылля ў Мінску, на якую будзе давацца льготны крэдыт, плануюць паменшыць да 15 метраў.**
- ✓ **Пры пастаноўцы на жыллёвую чаргу жыхару сталіцы будуць улічваць уласнае жыллё і ў Мінскім раёне.**
- ✓ **У Мінску на льготны крэдыт могуць разлічваць і «доўгажыхары» інтэрнатаў.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КІЕЎ ЗНАЙШОЎ СПОСАБ АСПРЭЧЫЦЬ КАНТРАКТЫ НА ГАЗ

**Украіна вырашыла ліквідаваць нацыянальную кампанію «Нафтагаз», якая з'яўляецца ўдзельнікам газавых дамоў з Расіяй. Прэм'ер-міністр краіны Мікалай Азараў заявіў, што на рынку будуць працаваць іншыя арганізацыі, а ранейшыя дамоўленасці з Масквой будуць перагледжаныя. Кіеў паказвае, што дзейныя кантракты супярэчаць украінскім законам.**

Урад Украіны звярнуўся з афіцыйным лістом да кіраўніцтва Расіі з прапановай правесці міждзяржаўныя перамовы па ўдакладненні паставак газу. Азараў падкрэсліў, што пры абмеркаванні газавай праблемы галоўным аргументам Украіны будзе невыкананне Расіяй умоў дамовы ад 2004 года. Кіеў спадзяецца заняцца рашэннем пытання аб пастаўках газу на саміце СНД у Душанбэ, дзе прысутнічаюць прэзідэнты Расіі і Украіны.

### ГРЭЦЫЯ ЗНОЎ БАСТУЕ

**Работнікі метро ў Афінах пасля летняга перапынку першыя сярод грэчаскіх забастоўшчыкаў адкрываюць новы сезон пратэстаў. Учора на 24 гадзіны спыніліся дзве веткі падземнага і адна — наземнага метро.**

Прафсаюз работнікаў сталічнага метрапалітэна заяўляе, што стачка накіраваная супраць магчымых звальненняў, пераводу супрацоўнікаў у іншыя галіны, скарачэнняў рабочых месцаў. Прафсаюзныя актывісты сцвярджаюць, што пераводзяцца служачыя, якім засталося ўсяго некалькі месяцаў ды выхаду на пенсію. На думку назіральнікаў, цяперашняй забастоўкай работнікі метро рыхтуюць глебу для перамоў з урадам і працадаўцамі напярэдадні падпісання новых калектыўных працоўных пагадненняў. У знак салідарнасці ў Афінах на 3 гадзіны спыняцца і трамваі. У Грэцыі акцыі пратэсту рэгулярна праходзяць у сувязі з жорсткімі антыкрызіснымі мерамі, якія прыняў мясцовы ўрад, каб атрымаць крэдытную падтрымку Еўрасаюза і МВФ і прадухіліць дэфолт.

### У АМЕРЫЦЫ ЗГУБІЛІ 16 ТЫСЯЧ АДЗІНАК ЗБРОІ

**Амерыканская арганізацыя Brady Center to Prevent Gun Violence апублікавала даклад, паводле якога з 2009 года са збройных заводаў знікла больш як 16 тысяч адзінак зброі, якая магла апынуцца ў руках злачынных груповак.**

Пры праверцы збройных прадпрыемстваў бюро не выявіла запісы аб продажы 16487 адзінак зброі, якіх не знайшлі на складах. Прытым праверка была праведзеная толькі на 20% збройных прадпрыемстваў. На многіх зніклых вінтоўках і пісталетах не было серыйнага нумара, што робіць зброю фактычна нябачнай для праваахоўных органаў. Зніклая зброя, як правіла, выкарыстоўваецца крымінальнымі групоўкамі. Як паведамляе CNN, даклад быў раскрытыкаваны з боку экспертаў па ўзбраеннях, упэўненых у тым, што апублікаваныя звесткі з'яўляюцца настолькі «недарэчнымі», што не могуць быць праўдай, да таго ж іх нельга праверыць, паколькі назвы кампаній, дзе знікае зброя, не прыводзяцца.

### ХАРАРЭ — НАЙГОРШЫ ГОРАД СВЕТУ



**Услед за лепшым горадам свету аналітыкі брытанскай даследчай арганізацыі Economist Intelligence Unit абгрунтавалі свой выбар і самога малапрыдатнага для жыцця горада. Ім была названая сталіца Зімбабве — горад Хараэ.**

Ён стаіць на апошнім месцы па ўмовах жыцця ў спісе са 140 сталіц свету. У рэйтынгу не ўдзельнічалі лівійскі Трыпалі, іракскі Багдад і іншыя гарады, размешчаныя ў зоне баявых дзеянняў. У Харарэ штодня адключаюць ваду і электрычнасць, а кошты ў крамах на тавары першай неабходнасці ўражваюць. Акрамя таго, што немалаважна, у Харарэ пастаянна захоўваецца пагроза ўспышак масавых хваляванняў, а ступень даступнасці медыцынскіх паслуг і паслуг грамадскага транспарту лічыцца вельмі нізкай.

### КАРМЛЕННЕ ГРУДЗЬМІ РОБІЦЬ ЖАНЧЫНУ АДВАЖНАЙ

**Жанчыны, якія кормяць дзяцей грудзьмі, у большай ступені схільныя агрэсіўна абараняць сваіх дзяцей і сябе ў параўнанні з жанчынамі, якія кормяць дзяцей з бутэлечкі або наогул не маюць дзяцей, даводзяць навукоўцы ў справаздачы, што была апублікаваная ў часопісе Psychological Science.**



А калі маці, якія кормяць дзяцей грудзьмі, агрэсіўна сябе паводзяць, у іх ніжэйшы крывяны ціск, чым у іншых жанчын. На думку навукоўцаў, гэта сведчыць пра наступнае: кармленне грудзьмі здольнае задушыць звычайны адказ арганізма на страх, даючы жанчынам мужнасць, неабходную для абароны сябе. Магчыма, гэты механізм дапамагае маці змагацца са стрэсам.

## Запрашальны білет

# У ГОСЦІ... ДА СВАІХ!

**Так было, так ёсць, так, спадзяёмся, будзе: у Дзень беларускага пісьменства да стэнда найстарэйшай (95-ы пайшоў!..) беларускай газеты (і адзінай — са штодзённых — беларускамоўнай) завітаюць яе сябры — чытачы, падпісчыкі, аўтары, дзелавыя партнёры... Завітаюць, каб засведчыць сваю сімпатыю і павагу, каб выказаць словы ўдзячнасці, прапановы і пажаданні, каб пазнаёміцца з журналістамі, каб нечым мо пачаставаць і... пачаставацца! Бо «Звязда» заўсёды сустракала сваіх хлебам-салам, а калі пашчасціць, то і пірагамі-піражкамі, гарачай гарбатай ці халодным квасам.**

А яшчэ — падчас свята (і зноў жа для сваіх) яна ладзіла і будзе ладзіць розныя забавы: конкурсы на лепшы анекдот і «вясёлую і праўдзівую гісторыю для рубрыкі «Алё, народ на провадзе!», песню і танец, свой альбо чужы вершык...

Само сабой, гасцям прапануюць удзел у адмысловай віктарыне і знаёмства з кнігамі звяздоўцаў Таццяны Падаляк «Нашчадкі вогненных вёсак», Анатоля Клешчука «Чарнобыль» і «Пад небам Беларусі», Валянціны Доўнар «Праз каханне». Дарэчы, асобныя з іх можна будзе набыць за вельмі вялікія грошы (калі яны ёсць), альбо... веды беларускай мовы і літаратуры. Юныя модніцы на нашым жа стэндзе змогуць зрабіць прыгожую прычоску, усе ахвотныя сфатаграфавацца, падпісацца...

Іншымі словамі, маленькі звяздоўскі дэсант у чарговы раз збіраецца на свята. На гэты раз, што вельмі прыемна, у Ганцавічы, дзе газету ведаюць, паважаюць і нават любяць. Таму чакаем сустрэч, знаёмстваў і напярэдадні пакуем прызы — фірменныя нататнікі, ручкі, кубкі, парасоны, модныя магніцікі, календары... Для сваіх сяброў, для чытачоў, якія ў газеты заўсёды былі, ёсць, і, спадзяёмся, будуць!

**Сустракаемся ў Ганцавічах!**

ISSN 1990 - 763X

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.09.2011 г. (для б/н разлікаў) | | | |
|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 5 152,00 | 1 чэшская крона | 302,72 |
| ▼ 1 еўра | 7 325,63 | 1 польскі злоты | 1 760,95 |
| 1 латвійскі лат | 10 342,27 | ▼ 1 расійскі рубель | 177,29 |
| 1 літоўскі літ | 2 124,80 | 1 украінская грыўня | 644,12 |

| Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|
| USD | 29,0604 |
| 10 UAH | 36,3255 |
| 10000 BYR | 56,6369 |
| EUR | 41,3762 |

# НАЦБАНК ВЯДЗЕ ПАДРЫХТОЎЧУЮ РАБОТУ ПА ВЫХАДЗЕ НА АДЗІНЫ ВАЛЮТНЫ КУРС

**Нацыянальны банк Беларусі вядзе падрыхтоўчую работу па выхадзе на адзіны валютны курс. Аб гэтым паведаміў учора журналістам першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Мікалай Лузгін, перадае БЕЛТА.**

«На адзіны валютны курс мы пачынаем выходзіць з сярэдзіны верасня, — адзначыў Мікалай Лузгін. — Цяпер вядзецца пэўная падрыхтоўчая работа, гэта цэлы комплекс мер». Праграма аб выхадзе на адзіны курс была падрыхтавана Саветам Міністраў і Нацыянальным банкам, адобрана Прэзідэнтам і часткова агучана ім на нарадзе 30 жніўня.

У мэтах развіцця гэтай праграмы Нацыянальны банк прыняў уласны план дзеянняў, які цяпер выконваецца, сказаў Мікалай Лузгін. Для гэтага трэба правесці шэраг падрыхтоўчых мер эканамічнага і тэхнічнага характару. Меры эканамічнага характару — гэта ў пэўнай ступені ўзмацненне грашова-крэдытнага і валютнага рэгулявання. Для гэтага нядаўна прыняты ўжо ўказ па скарачэнні льгот па абавязковым продажы валютнай выручкі. Уступіла ў дзеянне пастанова праўлення Нацыянальнага банка аб пашырэнні кола валют, па якіх ажыццяўляецца абавязковы продаж пры паступленні валютнай выручкі.

Таксама прыняты нядаўна ўказ Прэзідэнта аб рэгуляванні знешнеэканамічнай дзейнасці, дзе прадугледжваецца змяненне парадку выдачы дазволаў на прадаўжэнне тэрмінаў знешнеэканамічных аперацый. «Але, не чакаючы афармлення гэтага нарматыўнага дакумента, ужо ў аўторак Нацыянальны банк прыняў рашэнне, у адпаведнасці з якім мы спынілі поўнасцю выдачу дазволаў на прадаўжэнне тэрмінаў вяртання валютнай выручкі, — адзначыў Мікалай Лузгін. — Цяпер афармляецца адпаведная сумесная пастанова Савета Міністраў і Нацбанка наконт гэтага».

Мерай эканамічнага характару з'яўляецца і павышэнне стаўкі рэфінансавання да 27 працэнтаў. Яна будзе павышацца і далей у бліжэйшы час. «Гэта можна сказаць адназначна», — падкрэсліў прадстаўнік кіраўніцтва Нацбанка.

Ён таксама паведаміў аб падрыхтоўцы да выхаду на дадатковую сесію на біржы. «Па выхадзе на дадатковую сесію мы не вынаходзім веласіпед, — лічыць Мікалай Лузгін. — У нас у пачатку гэтага тысячагоддзя ўжо была дадатковая сесія, мы дзесьці такім шляхам праходзілі».

Такім чынам, на Беларускай валютна-фондавай біржы будзе асноўная сесія і дадатковая. На асноўнай сесіі, як і цяпер, будзе прадавацца валюта ў рамках абавязковага продажу і будуць задавальняцца заяўкі на першачарговыя патрэбы, перш за ўсё на энерганосьбіты. На дадатковай сесіі будзе ажыццяўляцца купля-продаж валюты па свабодным курсе. Усе жадаючыя суб'екты гаспадарання будуць выходзіць прадаваць валюту або купляць. Прычым адначасова будуць амаль поўнасцю спынены аперацыі на міжбанкаўскім рынку, каб усе аперацыі ажыццяўляліся на біржы па адным курсе, які будзе складвацца на аснове попыту і прапанавання.

Мікалай Лузгін растлумачыў аб дзеянні механізма так званага фіксінгу, калі выраўноўваецца попыт і прапанаванне. На аснове гэтага ўстанаўліваецца курс біржавых таргоў. Гэта значыць, пэўны час будуць дзве сесіі і будуць два курсы — асноўны курс, ён жа афіцыйны, па якім будзе весціся ўлік валютных аперацый, і курс дадатковай сесіі, ён будзе рыначны.

Што датычыцца інтэрвенцыі, то яны дапускаюцца кропкавыя, гэта значыць у выпадку нейкіх усплёскаў, тэхнічных ваганняў, калі таргі вядуцца па некалькіх валютах — долару, еўра, расійскаму рублю. Каб не дапусціць рэзкага зніжэння курсу, Нацыянальны банк будзе праводзіць згладжванне гэтых кан'юнктурных ваганняў. Яны будуць гасіцца інтэрвенцыямі Нацыянальнага банка. У цэлым жа курс другой сесіі будзе вызначацца попытам і прапанаваннем. «Каб ён не вельмі рэзка адрозніваўся ад афіцыйнага курсу, і будуць прыняты гэтыя ўсе дадатковыя меры — зацісканне попыту на валюту і на павелічэнне прапанавання», — адзначыў першы намеснік старшыні Нацбанка.

## Змяняюцца тэрміны рэфінансавання банкаў

У межах распрацаванага плана па выхадзе на адзіны курс беларускага рубля і з мэтай узмацнення жорсткасці манетарных умоў Нацыянальны банк скарачае да 7 дзён тэрміны рэфінансавання банкаў з дапамогай двухбаковых аперацый і аперацый на адкрытым рынку, паведамляе ўпраўленне інфармацыі Нацбанка.

Акрамя таго, часова прыпыняецца прадастаўленне банкам крэдытаў пад заклад закладных.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## Факт

### У МІНСКУ ПАД КОЛАМІ АЎТАМАБІЛЯ АПЫНУЛАСЯ ДРУГАКЛАСНІЦА

**Першы дзень верасня пачаўся з ДТЗ з удзелам школьнікаў. У Мінску пад коламі аўтамабіля апынулася другакласніца.**

Як паведамілі ў ДАІ Мінгарвыканкама, 1 верасня каля 19 гадзін 21-гадовы кіроўца на аўтамабілі «Форд Мандэа» рухаўся ў Мінску па дваровай тэрыторыі дома №4 па вул. Скрыпнікава, дзе здзейсніў наезд на дзяўчынку 2004 г.н., якая пераходзіла праезную частку. Школьніца дастаўлена ў бальніцу.

ДАІ нагадвае, што з 25 жніўня па 10 верасня праходзіць акцыя «Увага! Дзеці!». Аўтааматары павінны быць асабліва ўважлівымі падчас руху на ажыўленых вуліцах, побач з дзіцячымі ўстановамі і на дваровых тэрыторыях, не перавышаць хуткасць і не забываць уключаць бліжні свет фар. Хуткасць на дваровых тэрыторыях, згодна з правіламі дарожнага руху, не павінна быць больш за 20 км/г.

**Алена КРАВЕЦ.**

### ХЛОПНУЛА ДЗВЯРАМІ І... ЗАГІНУЛА

**У Круглянскім раёне (Магілёўская вобласць) жанчына загінула з-за абвальвання цаглянай сцяны веранды прыватнага дома, паведамілі БЕЛТА ў МНС Беларусі.**

Інцыдэнт адбыўся ў вёсцы Старое Радча. Паводле слоў гаспадара дома, дзе загінулая знаходзілася ў гасцях, жанчына моцна хлопнула дзвярамі веранды, пасля чаго і абвалілася частка сцяны таўшчынёй у паўцагліны. Жанчына загінула на месцы. Цела з-пад абломкаў сцяны даставалі работнікі МНС. У ведамстве дадалі, што, паводле іх інфармацыі, веранда была прыбудавана да дома каля 30 гадоў таму. Праваахоўныя органы праводзяць праверку.

### ЧАРГОВАЯ «БРОНЗА» МІХНЕВІЧА

Фота з архіва БЕЛТА.



**Беларус Андрэй Міхневіч стаў бронзавым прызёрам у штурханні ядра на чэмпіянаце свету па лёгкай атлетыцы, які праходзіць у паўднёвакарэйскім Тэгу, паведамляе БЕЛТА.**

У фінале Андрэй у сваёй лепшай спробе (трэцяй па ліку) штурхнуў ядро на 21,40 м. У астатніх пяці былі такія вынікі: 20,45 м, 20,49 м, 20,72 м, 20,64 м і 21,37 м. Чэмпіёнам свету стаў 21-гадовы прадстаўнік Германіі Давід Шторль, які ў заключнай шостай спробе (21,78 м) апярэдзіў знакамітага канадца Дзілана Армстранга (21,64 м), які заваяваў серабро.

Андрэй Міхневіч раней двойчы заваёўваў медалі чэмпіянатаў свету — золата ў Парыжы-2003 і бронзу ў Осацы-2007. На Алімпіядзе-2008 у Пекіне ён стаў бронзавым прызёрам. Такім чынам, у актыве беларускай каманды ўжо дзве ўзнагароды на гэтым чэмпіянаце свету па лёгкай атлетыцы. Раней серабро ў штурханні ядра сярод жанчын заваявала Надзея Астапчук.

### У МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ ЗА АДЗІН ДЗЕНЬ ЗАТРЫМАЛІ ДВУХ БУЙНЫХ ВАЛЮТЧЫКАЎ

**У Магілёве супрацоўнікі АБЭЗ Кастрычніцкага РАУС, падраздзяленні ДФР КДК і падраздзяленні КДБ за парушэнне парадку правядзення валютных аперацый затрымалі беспрацоўнага мясцовага жыхара 1962 года нараджэння. У яго было канфіскавана Br10,3 млн, 42,1 тыс. расійскіх рублёў, $3340 і 50 еўра.**

За аналагічнае злачынства ў Бабруйску супрацоўнікі мясцовага аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі, а таксама патрульна-паставой службы міліцыі і падраздзяленні ДФР КДК затрымалі беспрацоўнага мясцовага жыхара 1968 года нараджэння, у якога было канфіскавана Br17,2 млн і 40 тыс. расійскіх рублёў.

**БЕЛТА.**

### СТАЛІЦА НЕ ПРЫРАСТАЕ НЕМАЎЛЯТАМІ

**Натуральны прырост насельніцтва беларускай сталіцы (перавышэнне колькасці народжаных над колькасцю памерлых) у параўнанні з першым паўгоддзем 2010 года скараціўся ў 2,6 раза.**

Агульны каэфіцыент нараджальнасці ў цэлым па горадзе знізіўся і склаў на 1000 чалавек насельніцтва 10,5 народжаных супраць 11,2 за аналагічным перыяд 2010 года, гаворыцца ў справаздачы галоўнага статыстычнага ўпраўлення г. Мінска. Сёлета ў студзені—чэрвені ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам у сталіцы нарадзілася на 5,5 працэнта дзяцей менш — 9732. У той жа час у сталіцы памерла 9174 чалавекі, што на 3,3 працэнта больш, чым летась. Кожны чацвёрты памёр у працаздольным узросце.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

### ЦУКАР НЕ РАСТВАРЫЎСЯ

У Светлагорскім раёне раніцай затрыманы аўтамабіль прыватнага прадпрыемства з Кобрына, які без суправаджальных дакументаў перавозіў 3 тоны цукру. Да высвятлення абставін салодкі прадукт канфіскаваны. Тое ж адбылося і з 75 мяшкамі цукру (3,75 т), якія былі затрыманы ноччу ля мяжы з Расіяй у Добрушскім раёне. Непрацуючы ўладальнік растлумачыў, што тавар набываўся ім на тэрыторыі Гомеля ў крамах з мэтай наступнага вывазу і рэалізацыі на тэрыторыі РФ.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# МАТРЫЦА САЦАБАРОНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

***— Гэта, безумоўна, важна, што студэнты змогуць падзарабіць на рабочых месцах, якія не патрабуюць высокай кваліфікацыі. Разам з тым многія маладыя людзі хацелі б працаваць па профілі сваёй будучай спецыяльнасці. Аднак зусім не ўсе наймальнікі гатовы прымаць іх на работу...***

— Цяпер у Беларусі праводзіцца сур'ёзная карэкцыя зместу навучальнага працэсу, аб гэтым неаднаразова гаварыў Прэзідэнт. І хутка студэнт 3-4 курса будзе накіроўвацца на стажыроўку па спецыяльнасці. Мяркуем, што ён такім чынам будзе не толькі набываць вопыт работы, прымяняючы на практыцы атрыманыя ў ВНУ тэарэтычныя веды, але і атрымліваць заработную плату.

***— На нарадзе ў Прэзідэнта гаварылася аб спецыяльным фондзе, у якім будуць акумулявацца звышдаходы ад росту цэн. З якіх крыніц гэты фонд будзе фарміравацца, і якія механізмы будуць выкарыстоўвацца для пераразмеркавання сабраных сродкаў на сацпадтрымку?***

— Мы аб гэтым яшчэ думаем. Сродкі ў фонд будуць акумулявацца за кошт падаткаў ад атрыманага прыбытку. Калі хтосьці думае аб нейкіх адміністрацыйных выключэннях, то гэта не так. Усё будзе ў адпаведнасці з Падатковым кодэксам і нацыянальным заканадаўствам.

Калі цэны будуць павышацца, то павялічацца і сумы падаткаў, якія паступаюць у бюджэт. Нам неабходна прадумаць, праз якія механізмы гэтыя ўзросшыя паступленні пераразмеркаваць у інтарэсах людзей. Можа, праз заработную плату ў бюджэтнай сферы, праз фінансаванне адукацыі і медыцыны, праз пенсіі і стыпендыі. Усё гэта неабходна для таго, каб забяспечыць нармальны жыццёвы ўзровень насельніцтва.

Дзяржава гэтыя грашовыя сродкі ў які-небудзь мяшок складваць не збіраецца і не мае намеру траціць на ўласныя патрэбы. Праз бюджэт і адпаведныя фонды грошы будуць пераразмяркоўвацца ў інтарэсах грамадзян.

**Кацярына МАРКОВІЧ, БЕЛТА.**

# ПРЫ ВЫДАЧЫ ЛЬГОТНЫХ КРЭДЫТАЎ БУДЗЕ ЎЛІЧВАЦЦА НАЯЎНАСЦЬ ЖЫЛЛЯ НА ЎСЁЙ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

***А вось сёння можна дакладна казаць, хто ў наступным годзе можа разлічваць на атрыманне льготных крэдытаў пад жыллё?***

— Калі казаць канцэптуальна, то падыход такі. Ільготныя крэдыты змогуць атрымліваць тыя катэгорыі насельніцтва, якія і сёння маюць статус першачаргавікоў. Гэта шматдзетныя сем'і, ліквідатары наступстваў аварыі на ЧАЭС, людзі з пэўнымі хваробамі, сем'і з дзецьмі-інвалідамі, той, хто жыве ў вельмі старым жыллі і шэраг іншых грамадзян, якія сапраўды маюць патрэбу ў сур'ёзнай дзяржаўнай падтрымцы пры будаўніцтве жылля або маюць сёння права на атрыманне сацыяльнага жылля. Акрамя таго, у гэты раней складзены пералік ільготнікаў далучылі катэгорыю тых людзей, якія пражылі больш за 10 гадоў у інтэрнатах. Па вайскоўцах працягне дзейнічаць указ № 195 кіраўніка дзяржавы, які чапаць не будуць.

***— Днямі сярод знаёмых пачала гуляць пагалоска пра тое, што неўзабаве пачнуць улічваць усё ўласнае жыллё будучага крэдытаатрымальніка, нават тое, якое бабуля падаравала яму ў вёсцы...***

— Цяпер разглядаецца варыянт уліку ўласнай жылплошчы па ўсёй рэспубліцы, пры вызначэнні памераў ільготнага крэдыту. Раней улічвалася толькі жыллё таго населенага пункта, у якім ты жывеш. Людзі мелі добрыя дамы ў вёсках ці кватэры ў райцэнтрах, але ў якасці чаргавікоў за льготныя крэдыты будавалі сабе дастатковае якаснае жыллё ў абласных цэнтрах або ў сталіцы. Заўтра такі фокус з мноствам жылля ў розных гарадах ці вёсках ужо не пройдзе. Сёння Дзяржаўны камітэт па маёмасці мае агульную цэнтралізаваную базу звестак па ўсіх жыллёвых аб'ектах і іх уласніках на тэрыторыі Беларусі. Карыстацца гэтай базай у электронным фармаце даволі проста. Таму неўзабаве тыя грамадзяне, якія маюць недзе на тэрыторыі Беларусі яшчэ ўласнае жыллё, на льготны крэдыт пры будаўніцтве жылля разлічваць не змогуць або атрымаюць гэты крэдыт у значна меншых памерах.

***— Падобны прынцып уліку жылля будзе дзейнічаць і пры пастаноўцы ў чаргу тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў?***

— Пры пастаноўцы на жыллёвы ўлік прапануюцца больш дэмакратычныя нормы. Тут амаль нічога не змянілася. Выключэнне мае толькі Мінск, калі грамадзян будуць ставіць у жыллёвую чаргу з улікам наяўнасці жылля не толькі ў сталіцы, але і ў Мінскім раёне.

Для відавочнасці разгледзім сітуацыю з жыхаром Мінска. Каб стаць на жыллёвы ўлік, ён і яго сям'я павінны мець ва ўласнасці жыллё ў Мінску і Мінскім раёне плошчай не больш за 10 м кв. на чалавека. Новы чаргавік павінен пражыць у Мінску не менш за 10 гадоў. Атрымаць ільготны крэдыт пад будаўніцтва жылля могуць толькі сацыяльныя першачаргавікі, шматдзетныя сем'і, вайскоўцы і тыя, хто пражыў у інтэрнатах больш за 10 год.

Аднак тое, што вы трапілі і ў гэты спіс, аўтаматычна не гарантуе атрыманне льготнага крэдыту. Цяпер ААТ «Беларусбанк» пацікавіцца ў крэдытаатрымальніка наконт таго, якое яшчэ жыллё ў яго ёсць на ўсёй тэрыторыі нашай краіны. Калі плошча ўласнага жылля ў грамадзяніна дастатковая, тады льготны крэдыт ён не атрымае.

***— Зразумеў. Цяпер усе астатнія чаргавікі, але не льготнікі, павінны будуць шукаць нейкія іншыя шляхі вырашэння свайго жыллёвага пытання. Дзе выйсце?***

— Рэцэпт тут просты. Гэта ўласныя зберажэнні і крэдыты ў банках на агульных падставах. У Беларусбанку для асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў прапануюцца доўгатэрміновыя жыллёвыя крэдыты пад 27 працэнтаў гадавых. Для нечаргавікоў кошт крэдытаў павялічваецца да 33 працэнтаў гадавых.

***— Магчыма, запрацуе сістэма будзберажэнняў?***

— Не. Цяпер гэты напрамак не актуальны. Каб сапраўды запрацавала сістэма будзберажэнняў, неабходна некалькі гадоў стабільнага развіцця эканомікі. Сёння, калі стаўка рэфінансавання павялічылася да 27 працэнтаў і інфляцыя з пачатку года крочыць у бок 50 працэнтаў, сістэма будзберажэнняў эканамічна не працуе. Гэтая сістэма можа дзейнічаць толькі ў такіх фінансавых умовах, калі ўзровень інфляцыі складае не больш за 8—10 працэнтаў.

***— У сённяшніх эканамічных умовах, калі камерцыйныя банкі па дэпазітах даюць да 30 працэнтаў, ці плануецца перагледзець працэнты па льготных крэдытах у бок павелічэння?***

— Не. Для шматдзетных сем'яў захоўваецца крэдыт на 40 гадоў пад 1 працэнт. Для астатніх ільготнікаў крэдыт на будаўніцтва жылля будзе выдавацца тэрмінам на 20 гадоў пад 5 працэнтаў гадавых.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Падзея

# Сусветны дзень міру ў музеі Вялікай Айчыннай

**СУСВЕТНЫ дзень міру вырашылі адзначыць у музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. 1 верасня тут сумесна з Цэнтральным батанічным садам НАН Беларусі праводзілася акцыя «Зберагчы б!»**

У выставачнай зале музея былі сімвалічна прадстаўлены два супрацьлеглыя пачаткі — вайна і мір. Першы — экспазіцыяй з прадметамі ваеннага ліхалецця, другі — у выглядзе вялізных букетаў кветак.

На слайдах адбывалася прэзентацыя раслін розных кантынентаў. Былі прадстаўлены вялізныя букеты з вяргіняў, сланечнікаў, гладыёлусаў, геленіума і інш. На думку прысутных, кветка, якую можна назваць сімвалам Беларусі, — валошка.

Як сведкі жахаў мінулай вайны на акцыі прысутнічалі ветэраны: Клаўдзія Рыгораўна Крохіна, снайпер Першага беларускага фронту, Лідзія Кандрацьеўна Волкава, якая ў якасці медработніка дайшла да самага Берліна, і Ніна Міхайлаўна Сакалова — працаўніца тылу. Яны былі вельмі ўзрадаваны, што прысутнічаюць на святкаванні Дня міру, бо мір здабываўся менавіта іх рукамі.

На акцыю завітала шмат школьнікаў — з прыгожымі бантамі, у белых кашулях. Яны сталі яскравым сведчаннем спакойнага, шчаслівага жыцця.

Усе ўдзельнікі акцыі выходзілі з музея з кветкамі, быццам несучы з сабою і мір, і жыццё, і прыгажосць.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

Минский городской центр недвижимости

## Извещение о проведении 05 октября 2011 года открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО Ордена «Знак Почета» «Автокомбинат № 4»

| Номер предмета торгов | 1 | 2 |
|---|---|---|
| Наименование и характеристики продаваемого имущества | Здание административно-хозяйственное общей площадью 529,3 кв.м, литер А 2/к, инвентарный номер 500/С-27625 | Автостоянка (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства) общей площадью 5229.0 кв.м, инвентарный номер 500/С-1011026 |
| Сведения о земельном участке | Земельный участок площадью 0,0849 га, кадастровый номер 500000000002005019, целевое назначение: эксплуатация и обслуживание административно-бытового здания | Земельный участок площадью 0,5229 га, кадастровый номер 500000000002006902, целевое назначение: эксплуатация и обслуживание открытой автостоянки |
| Местонахождение продаваемого имущества | г. Минск, пр-т Партизанский, д. 178 | |
| Сведения о продавце | ОАО Ордена «Знак Почета» «Автокомбинат № 4», ул. Социалистическая, 26, 220102, г. Минск, телефоны: (017) 243 31 93, (029) 341 31 59 | |
| Сведения об организаторе аукциона | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефон (017) 227 48 36 | |
| Начальная цена предмета торгов | 1 203 000 000 белорусских рублей | 1 287 000 000 белорусских рублей |
| Сумма задатка | 120 000 000 белорусских рублей | 128 000 000 белорусских рублей |
| Наличие обременений | Аренда | Аренда |

Торги проводятся в соответствии с порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО Ордена «Знак Почета» «Автокомбинат № 4», утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с Положением.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019, в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, код 153001369, получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Заявитель, желающий участвовать в торгах по нескольким предметам торгов, вносит задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая (окончательная) цена фиксируется в протоколе о результатах аукциона и не включает НДС.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи.

Аукцион состоится **05 октября 2011 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 05.09.2011 по 03.10.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. **Телефоны для справок: (017) 227 48 36, (017) 243 31 93, (029) 341 31 59.**

Минский городской центр недвижимости

## Извещение о проведении 23 сентября 2011 года открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

| Номер предмета торгов | № 1 | № 2 |
|---|---|---|
| Наименование и характеристики продаваемого имущества | Металлический склад общей площадью 488,2 кв.м (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | Здание специализированное иного назначения общей площадью 249,4 кв.м, (здание специального назначения) |
| Местонахождение имущества | г. Минск, ул. Ваупшасова, 3Г/1 | г. Минск, ул. Радиальная, 25 |
| Организатор аукциона | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, ком. 10, 220030, г. Минск | |
| Балансодержатель | Строительно-монтажное открытое акционерное общество «Белзаводстрой» | |
| Начальная цена | 545 432 000 белорусских рублей | 503 837 000 белорусских рублей |
| Сумма задатка | 54 000 000 белорусских рублей | 50 000 000 белорусских рублей |

Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019, в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, код 153001369, получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Заявитель, желающий участвовать в торгах по нескольким предметам торгов, вносит задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый предмет торгов.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется участником, выигравшим торги.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **23 сентября 2011 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 05.09.2011 по 21.09.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок:**
**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости».**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА С ПРИМЕНЕНИЕМ МЕТОДА ПОНИЖЕНИЯ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности, и на право заключения договоров аренды земельных участков для обслуживания недвижимого имущества

**Аукцион состоится 6 октября 2011 г. в 12.55 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.**

Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел. 8(0222) 311185, 229022, 223375.

Продавцы недвижимого имущества: по лоту № 1 – Министерство промышленности Республики Беларусь, тел. 8(0225)474940; по лоту № 2 – Департамент охраны Министерства внутренних дел Республики Беларусь, тел. 8(0222)226357; по лоту № 3 – ГУ «Бобруйское эксплуатационное управление Вооруженных Сил», тел. 8(0225)481011; по лоту № 4 – учреждение образования «БГСХА», тел.(802233)59381,59382; по лоту № 5 – концерн «Белнефтехим», тел. 8(0222) 22 21 98, 39 18 26.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи объектов республиканской собственности на аукционах с применением метода понижения начальной цены, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 8 августа 2009 № 1049.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104, начиная со дня публикации извещения. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами – **4 октября 2011 г.** с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00. Заключительная регистрация участников аукциона – **6 октября 2011 г.** с 10.00 до 10.50. С объектами можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни до установленного последнего дня подачи заявлений на участие в аукционе включительно.

| № лота | Сведения о предметах аукциона: Информация о недвижимом имуществе: Наименование и краткая характеристика | Место нахождения | Цена имущества, тыс. руб.: начальная | Цена имущества, тыс. руб.: минимальная | Информация о земельных участках: Площадь, га | Срок аренды, лет | Начальная цена права заключения договора аренды земельного участка, тыс. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Находящиеся в безвозмездном пользовании по договору у ОАО «Бобруйский машиностроительный завод» капитальные строения бывшего подсобного хозяйства и строительные материалы | Могилевская обл., Бобруйский район, Вишневский сельсовет, дер. Пересово | 89 837,576 | 20 302,976 | 3,5 | 99 | 15 792,0 |
| | Краткая характеристика имущества, входящего в состав лота: здание насосной станции одноэтажное, кирпичное, 14,13 кв.м с водонапорной башней металлической и скважиной глубиной 52 м, здание склада для ульев одноэтажное, бревенчатое, 75,95 кв.м, здания персонала № 1 и № 2 одноэтажные, кирпичные, 84,1 и 81,18 кв.м, здание зернотока одноэтажное, 250,26 кв.м, стены – волнистый шифер с воротами специальными металлическими 13 кв.м – 2 шт., здание коровника с пристройкой одноэтажное, 716,03 кв.м, стены – крупные блоки с добавлением кирпича, здание конюшни одноэтажное деревянное, частично разрушенное, 79,24 кв.м; строительные материалы | | | | | | |
| | **Начальная цена предмета аукциона 105 629,576 тыс. руб. Минимальная цена предмета аукциона 36 094,976 тыс. руб.** | | | | | | |
| 2 | Административное здание одноэтажное, шлакобетонное, 139,7 кв.м, гараж панельный, 67,5 кв.м | Могилевская обл., г.п. Краснополье, ул. Зевина, д. 39 | 38 552,922 | 7 710,585 | 0,1591 | 50 | 9 838,698 |
| | **Начальная цена предмета аукциона 48 391,62 тыс. руб. Минимальная цена предмета аукциона 17 549,283 тыс. руб.** | | | | | | |
| 3 | Капитальные строения: здание 1/39 поликлиники одноэтажное кирпичное 652 кв.м с асфальтовым мощением 42 кв.м; сети водопровода 73,6 м, сети канализации 153,85 м, кабельные линии 143,9 м | Могилевская область, г. Бобруйск, военный городок № 1 «Крепость» | 1 899 000,952 | 379 800,251 | 0,2368 | 30 | 125 562,076 |
| | **Начальная цена предмета аукциона 2 024 563,028 тыс. руб. Минимальная цена предмета аукциона 505 362,327 тыс. руб.** | | | | | | |
| 4 | Незавершенное законсервированное капитальное строение (тепличный комбинат) площадью 885,7 кв.м, готовность строения 46% | Могилевская обл., г. Горки, ул. Новопроектная | 659 284,845 | 131 856,969 | 1,1230 | 25 | 113 654,854 |
| | **Начальная цена предмета аукциона 772 939,699 тыс. руб. Минимальная цена предмета аукциона 245 511,823 тыс. руб.** | | | | | | |
| 5 | Здания и сооружения базы отдыха «Надежда», находящиеся по договору безвозмездного пользования у ОАО «Могилевский «ЗИВ» | Могилевская обл., Могилевский р-н, район дер. Межисетки | 1 859 510,925 | 371 902,185 | 5,2617 и 0,3600 | 50 | 1 167,600 |
| | **Начальная цена предмета аукциона 1 860 678,525 тыс. руб. Минимальная цена предмета аукциона 373 069,785 тыс. руб.** | | | | | | |

**Условия для победителей аукциона в отношении земельных участков, право заключения договоров аренды которых входит в состав лотов:**

**№ 1** – в случае изменения целевого назначения объектов недвижимого имущества: получение в установленном порядке разрешения Бобруйского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

**№ 3** – заключение победителем аукциона с горисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения горисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения горисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2-х лет; осуществление строительства объекта в сроки, установленные проектно-сметной документацией.

**№ 4 –** получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения Горецкого райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий два года; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; заключение победителем аукциона с Горецким райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения Горецкого районного исполнительного комитета о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок.

**№ 5** – приступить к занятию земельных участков в течение шести месяцев со дня получения документов, удостоверяющих государственную регистрацию создания земельных участков и возникновения прав на них; в случае изменения целевого назначения объекта недвижимого имущества получить в установленном порядке разрешение Могилевского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий двух лет; заключить с Могилевским райисполкомом договор аренды земельных участков и осуществить государственную регистрацию права данной аренды.

**Победителю аукциона в отношении земельного участка, право заключения договора аренды которого входит в состав лота № 3**, предоставляется возможность рассрочки платежа по внесению платы за право заключения договора аренды земельного участка на срок, не превышающий 2 лет со дня принятия Бобруйским горисполкомом решения о предоставлении земельного участка.

Земельные участки, право заключения договора аренды которого входит в состав лотов № 1 и № 5, расположены в водоохранных зонах реки Березина и реки Лахва, соответственно, в которых устанавливается специальный режим хозяйственной деятельности, которая должна осуществляться с соблюдением мероприятий, предотвращающих загрязнение, засорение и истощение вод. С перечнем ограничений в использовании указанного земельного участка можно ознакомиться у организатора аукциона.

Капитальное строение (здание 1/39 поликлиника), входящее в состав лота № 3, является историко-культурной ценностью. Согласно Закону Республики Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» победитель аукциона обязан подписать охранное обязательство.

**Задаток в сумме 10 000,0 тыс. белорусских рублей** перечисляется до момента подачи заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в фонд «Могилевоблимущество» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, а также копии учредительных документов юридического лица без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, перечисленные выше, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков.

Срок заключения договора купли-продажи недвижимого имущества и договора аренды земельного участка – не позднее 2 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат.

Оплата за предмет аукциона осуществляется денежными средствами в белорусских рублях по безналичному расчету без предоставления рассрочки. Оплата за объекты недвижимости производится в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи имущества.

## УДЗЕЛЬНІКАМ І ГАСЦЯМ СВЯТКАВАННЯ XVIII ДНЯ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА

**ДАРАГІЯ СЯБРЫ!**

Рады вітаць вас у горадзе Ганцавічы Брэсцкай вобласці на цудоўным свяце беларускага пісьменства, якое стала ў апошнія гады яркім сімвалам духоўнай сілы, маральнай чысціні, творчага развіцця і цеснай сувязі з агульнаславянскімі вытокамі.

Гісторыя гэтага цудоўнага беларускага горада звязана з імем сусветна вядомага беларускага песняра Якуба Коласа, творчасцю сучасных паэтаў і пісьменнікаў, сярод якіх Алесь Каско, Міхась Рудкоўскі, Васіль Праскураў і іншыя.

Гэтае свята — даніна павагі продкам, якія заклалі фундамент асветы і пісьменства, усім тым, хто сваімі творамі ўпрыгожыў айчынную і сусветную літаратуру.

З павагай адзначаю, што Рэспубліка Беларусь па праве з'яўляецца прадаўжальніцай лепшых традыцый у галіне кнігадрукавання.

У рамках святкавання Дня беларускага пісьменства экспануецца стэнд «Выдавецкія праекты Саюзнай дзяржавы», адбудуцца прэзентацыі саюзных праектаў у гэтай сферы, якія рэалізуюцца, і новых.

Гэтае свята на беларускай зямлі ўяўляе сабой магчымасць творчых сустрэч і прафесійных дыялогаў аўтараў і чытачоў, выдаўцоў і паліграфістаў, дазволіць удзельнікам азнаёміцца з навінкамі кніжнай індустрыі і будзе садзейнічаць умацаванню гаспадарчых і творчых сувязяў, у тым ліку паміж Беларуссю і Расіяй.

Дазвольце шчыра пажадаць усім удзельнікам святкавання Дня беларускага пісьменства духоўнага ўзвышэння ад стасункаў з мудрым і цудоўным, радасных сустрэч з новым і цікавым, дабра і дабрабыту!

**З павагай П. БАРАДЗІН, Дзяржаўны сакратар Саюза Беларусі і Расіі.**

## СЯБРОЎСТВА НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

— Як не любіць роднае? — перапытвае Андрэй Ярашэвіч маё «За што вы любіце «Звязду?» і працягвае: — Я сябрую з газетай, гэта значыць выпісваю яе, з 1964 года.

Андрэй і Надзея Ярашэвічы жывуць у вёсцы Хатынічы Ганцавіцкага раёна. Выгадавалі траіх дзяцей. Пенсіянеры. У Андрэя Андрэевіча настаўніцкі стаж, не паверыце, 47 (!) гадоў. Але каб адпачываць... Аднавяскоўцы выбралі не толькі старастам вёскі, але і дэпутатам сельсавета. Імкнецца не падводзіць землякоў, апраўдваць іх давер. Надзея Васільеўна — удзельніца хатыніцкага вакальнага ансамбля «Надзея», рыхтуецца да выступлення на свяце беларускага пісьменства.

— У Хатынічах уся мая радня таксама падпісваецца на «Звязду», — кажа Андрэй Ярашэвіч. — Сапраўды родную для нас газету на роднай мове!

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**



# ЗЯМЛЯ ЖЫВОГА СЛОВА



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Часам завядзеш размову пра палескія гарады і вёскі, а ў цябе, нібы ў казачніка, недаверліва ўдакладняюць: дзе яны знаходзяцца? А ўсё таму, што ганцаўская зямля яшчэ як след не «раскручана». Нягледзячы на ўнікальныя прыродныя багацці і цэлае сузор'е таленавітых рупліўцаў беларускага слова, якое яна дала Беларусі. Але літаральна заўтра гэтая недарэчнасць будзе нарэшце выпраўлена. І Ганцавічы прачнуцца вядомымі на ўсю краіну. Таму што заўтра яны стануць сталіцай аднаго з найважнейшых беларускіх свят — Дня беларускага пісьменства. Паспрабуй пасля гэтага скажы, што не ведаеш пра тое, што на гэтай зямлі жыў і працаваў наш пясняр Якуб Колас, што яна выхавала славутага фальклярыста Аляксандра Сержпутоўскага і што заўсёды была скарбніцай, поўнай народных талентаў і прыгожых традыцый. І, вядома, калыскай новых імёнаў, для якіх простае роднае слова было і застаецца найбольшай з усіх каштоўнасцяў. Менавіта таму Ганцавічам была даверана эстафета прымаць у сябе гасцей і ўдзельнікаў гэтага штогадовага маляўнічага і запамінальнага свята. Бо да таго ж, як уласціва палешукам, мясцовыя жыхары ўмеюць як след падрыхтавацца і паказаць усю сваю шырокую і гасцінную душу.

Заўтра ўдзельнікі свята, спадзяюся, адчуюць сапраўдную шчырасць паляшуцкай душы таксама і праз паэтычнае слова, якое будзе гучаць з вуснаў саміх паэтаў, народжаных на ганцаўскай зямлі. Праз іхняе, часам шчымлівае, прызнанне сваёй ціхай зялёнай радзіме. Як у гэтых радках паэта Віктара Гардзея:

*«Мая зямля — мая калыска,*
*Дазволь схіліць мне галаву,*
*Ля помнікаў і абеліскаў*
*Люблю, працую і жыву.*
*Люблю свой край у шуме хвояў,*
*Працую шчыра дзень пры дні.*
*Жыву я на зямлі герояў —*
*На імі ўзятай вышыні...»*

З вышыні птушынага палёту, дакладней, з борту самалёта паветранай аховы лясоў ганцаўская зямля — сапраўдная зялёная краіна. Неабсяжныя балоты, нібы тайга, бяскрайнія лясы. У любое надвор'е з асалодаю ўглядаешся ў адвечныя краявіды, і няма такой моцы, каб наталіць смагу гэтага захаплення. Добра, што ўнікальныя балотныя куточкі захаваліся ў першасным выглядзе і ў дадатак узятыя пад ахову. У раёне ажно пяць заказнікаў мясцовага і рэспубліканскага значэння.

«Борскі», «Ялоўскі», «Галь», «Падвялікі мох», «Выганашчанскае». Неўзабаве прыйдзе час, калі тут будуць пракладзены шматлікія турыстычныя і экалагічныя сцяжыны, не кажучы пра звычайны агратурызм. Сярод балот і лясоў блішчаць люстэркі невялікіх азярцоў. Але ёсць тут і вялікая вада: на захадзе раён падпірае сапраўднае мора — возера Выганашчанскае, на ўсходзе плешчацца вадасховішча Лактышы. Як не паэтызаваць гэткую прыгажосць, не быць прасякнутым да яе любасцю! Як некалі былі ўлюбёныя ў яе паэты Уладзімір Марук, Іван Кірэйчык, Мікола Купрэеў, Іван Лагвіновіч, Міхась Рудкоўскі...

Радзіма Міхася Рудкоўскага — вёска Востраў. У мясцовай школе, якая носіць імя паэта, створаны літаратурны музей. Настаўнікі часта даюць дзецям заданне запісваць успаміны аднавяскоўцаў пра таленавітага земляка. На ўскраіне вёскі жыве малодшая сястра паэта, бібліятэкарка з 30-гадовым стажам Лідзія Рудкоўская. Яна цудоўная апавядальніца, і яе ўспаміны пра братава дзяцінства ўспрымаюцца дзецьмі з вялікай асалодай. У Востраў плануецца прыезд групы землякоў-пісьменнікаў, каб наведаць магілу паэта. Але Лідзія Міхайлаўна, тым не менш, збіраецца на свята ў Ганцавічы, бо гэта і свята ў гонар яе таленавітага брата.

З Вострава недалёка да Лактышоў. Дарога вядзе праз Гуту — радзіму паэта Уладзіміра Марука, былога звяздоўца. У рэдакцыі нашай газеты яго, загадчыка аддзела культуры, яшчэ добра памятаюць і з душэўнасцю прыгадваюць ягоныя вершы:

*«.. Я з тых, хто не вякуе,*
*Хто сее і хто жне.*
*Прашу, пакуль жывы я,*
*Не дбайце пра мяне...»*

У Лактышах не шмат захавалася старажытнасці. Адна з рэліквій — званіца — узор драўлянага дойлідства. Колькі ж давялося ёй перажыць навал!. І вось нядаўна са званіцы зладзеі-вандалы спрабавалі зняць вялікі звон. Пра гэта распавёў жыхар Лактышоў работнік культуры Іосіф Ленкавец. Ён прыгадаў, як у дзяцінстве на Вялікдзень кожны жыхар мог узлесці на званіцу і біць у звон, каб усе адчувалі, якое свята на душы. Іосіф Навумавіч з'яўляецца стваральнікам адзінага ў краіне пакоя-музея рыбалоўства. А яшчэ Лактышы цікавыя тым, што ў будынку былой школы месціцца адразу тры музеі. Акрамя пакоя з рыбацкімі прыладамі і чучаламі рыб, тут ёсць мемарыяльны музей героя-разведчыка Паўла Зуйкевіча і музей «Антыбахус», пра якія мы ўжо распавядалі на старонках аднаго з нумароў «Звязды».

І ўсё ж літаратурная Ганцаўшчына пачынаецца з вёскі Люсіна. (Гэта не стане аспрэчваць ніводны з сённяшніх майстроў слова гэтай зямлі). Бо менавіта тут пачынаў сваю настаўніцкую працу будучы нацыянальны класік Якуб Колас. І гэтую зямлю, з яе звычаямі і адвечнымі клопатамі, жыццё палешукоў, іхнія норавы і характары ён намаляваў сваім узнёслым словам у трылогіі «На ростанях», якую павінен прачытаць і ведаць кожны беларус.

У Люсіне будучы народны паэт пражыў усяго дзве зімы. Але ўсё жыццё люсінцы з удзячнасцю памятаюць свайго колішняга настаўніка з народнага вучылішча Кастуся Міцкевіча.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**












## Паэтычным радком

### Алесь КАСКО



**СОН ПРА 2085 ГОД**

*Стаяў на рагу*
*вуліцы Рагнеды,*
*блізка помніка*
*сённяшняму*
*пачаткоўцу,*
*якога яшчэ*
*не друкуюць раёнкі,*
*і слухаў,*
*як з расхрыстанага*
*акна*
*гучала матчына калыханка.*
*Я так захапіўся, што не заўважыў,*
*як аб мае этнаграфічныя чаравікі*
*зачапіліся двое першакласнікаў.*
*«Даруйце, — сказаў мне адзін,*
*— калі ласка!»*
*Другой, а гэта была дзяўчынка,*
*я дапамог падняць новую кніжку*
*з залацістымі літарамі:*
*«Роднае слова».*
*Зрэшчы, нічому я тут не здзівіўся,*
*бо і ў 1985-м*
*не верыў, што ўсё можа быць інакш.*

**1985**

❑ ❑ ❑

### Міхась РУДКОЎСКІ



*Жыву ў лясах,*
*глыбокіх і прасторных,*
*Пад клёнамі*
*адвечнымі жыву.*
*Цярушыць поўнач*
*пыл высаказорны*
*На твар задумны мой,*
*на галаву.*
*Усё тут проста,*
*мудра, суразмерна.*
*Я свой тут, нібы клён,*
*я свой, бы звер.*
*Тут, у лясах, я чую кожным нервам*
*Гармонію і рытм нябесных сфер.*
*І музыкай высокай паланёны,*
*Я досвіткам праводжу, як паслоў,*
*Удалеч, к знакам Задыяка, звёны*
*І жураўлёў, і дум маіх, і сноў.*

❑ ❑ ❑

### Віктар ГАРДЗЕЙ



*На Палессі*
*матчынае мовы*
*Ёсць яшчэ жывыя*
*астравы,*
*Дзе гаркоту*
*здыме пах мядовы*
*І суцешыць*
*пошум баравы.*

*Ёсць яно,*
*гняздоўе слоў*
*чароўных —*
*Вёска, дзе жыве мая радня.*
*Ды шкада: прыйшоў сюды бязмоўны,*
*Безнацыянальны старшыня.*

*Значыць, будуць смерчы пылавыя,*
*Значыць, бор спілуюць на харчы.*
*Нездарма сабака злосна вые*
*На збялелы месяц уначы.*

*І сцінае хваляванне горла:*
*Як збяднела родная зямля!*
*Астравы, дзе мова не памёрла,*
*У тумане бачацца здаля.*

*Зарыкае поплаў вечаровы,*
*І сціхае бор, пакуль жывы,*
*І, як птушкі, прылятаюць словы*
*На свае лясныя астравы.*

❑ ❑ ❑

### Уладзімір МАРУК



**ДОЎГА**

*Дрэва з гары*
*доўга ідзе, доўга.*
*Лепшага з нас*
*хутка народзяць маці.*
*Можна любіць так,*
*як ваду стронга.*
*Перад вайною*
*ў матчыны сны*
*трапіць*

*Нельга.*
*І ўсё ж доўга ідзе дрэва.*
*Можна забыць,*
*як і адкуль слова,*
*Можна вярнуць гнеў і адчай спевам,*
*Волю вярнуць*
*сляпою з аковаў*
*Нельга.*
*І ўсё ж*
*дрэва яшчэ няблізка.*
*Можна любіць,*
*можна забыць,*
*нават вярнуцца.*
*На вершаліне*
*вецер люляе калыску.*
*А да камля*
*чорныя сны крадуцца.*

# САГРЭТЫЯ СВЯТАМ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мне давялося бачыць, якімі цудоўнымі вышыванымі арнаментамі ўпрыгожваюць ручнікі і народнае адзенне ў Доме рамёстваў. Дэкаратыўныя матывы без эклектыкі, у чырвоным колеры, здаецца, прыйшлі з мінулых стагоддзяў. Такая высокая культура беларускага арнаменту сведчыць, што майстры адштурхоўваюцца ў сваёй рабоце ад твораў, якія дасталіся ім у спадчыну, а гэта звычайныя вышываныя кашулі, фартушкі, ручнікі... А на Алеі пісьменства ўстаноўлены памятныя знакі, на якіх у бронзе адліты імёны паэтаў: Міхася Рудкоўскага, Уладзіміра Марука, Алеся Каско ...

**— Уладзімір Міхайлавіч, а для Ганцавічаў, жыхароў, вас асабіста. Дзень пісьменства — гэта...**

*— Што Ганцавічам дало свята, відаць адразу, ды і жыхарам сёння прыемна прайсціся па абноўленым горадзе. Атрымаў вялікае задавальненне і я, бо пра гэты момант даўно марыў. Крыху нават крыўдна было, калі бачыў, як Дажынкамі ці Днём пісьменства абнаўляўся чарговы райцэнтр. Народ у нас працавіты, але ўрадлівасцю зямлі мы не можам пахваліцца, і ўсё ж стараемся. А каму не прыемна ўвага?! Вось у Ганцавічы прыедуць прадстаўнікі 21 краіны. Да нас цікавасць маюць паважаныя асобы з Індыі, Кітая, Карэі, Славакіі...*

**— І ўсё ж хацелася б ведаць, наколькі «прыклалі руку» да свята жыхары горада? А можа, чакалі, пакуль будаўнікі ўсё прывядуць да ладу?**

*— Людзі прымалі самы актыўны ўдзел у суботніках і іншых мерапрыемствах па ўпарадкаванні горада, падрыхтоўкі яго да свята. Але здараліся і накладкі ў прыватным сектары. Напрыклад, далі чалавеку фарбу каб ён пафарбаваў свой плот. А ён «паквэцаў» штыкетнік для адводу вачэй і пусціў фарбу на дом. Усё, што ў горадзе зроблена, — гэта зроблена для людзей, і думаю, што яны гэта разумеюць. Ва ўсякім разе хочацца ў гэта верыць.*



**— Аднойчы вы сказалі: «Вось каб мне тыя 60 мільярдаў, то раён стаў бы іншым». Размова ў нас ішла пра гаспадарку з Пружаншчыны, у якую Нацыянальны банк уклаў тыя мільярды. Здаецца, Ганцавічы атрымалі значна больш?**

*— Але ж грошы адпушчаны пад канкрэтнае мерапрыемства — Дзень беларускага пісьменства, і ад гэтага давялося адштурхоўвацца. А пры свабодным раскладзе можна было б фінансы размеркаваць па ўсім раёне.*

**— Сёння ўжо відавочна, што будаўнікі справіліся — уклаліся ў тэрмін. А не ўзнікала думка, што не паспееце да 4 верасня? Аб'ём работы вялікі.**

*— Як можна было не ўкласціся ў тэрмін, калі да Ганцавічаў была асаблівая ўвага. Да нас неаднаразова прыязджалі віцэ-прэм'ер Анатоль Тозік, а таксама міністр інфармацыі Алег Пралляскоўскі, міністр культуры Павел Латушка... Сітуацыю трымалі пад кантролем, бо Дзень беларускага пісьменства — рэспубліканскае свята.*

**— Летась у Ганцавічах прайшло абласное Свята сямейнай творчасці. Пасля Дня пісьменства, напэўна, ужо не да свят будзе — усе стаміліся?**

*— Свята сямейнай творчасці праводзіцца раз у два гады, і ў наступным годзе мы яго правядзём. Безумоўна, такое рэспубліканскае мерапрыемства адбірае шмат сіл, але людзі ўжо пытаюцца: «А чаму ў Ганцавічах не правесці «Дажынкі»?*

**— Думаю, у гэтым ёсць рацыянальнае зерне, бо дзяржаве можна будзе зэканоміць: шмат ужо зроблена. І ўсё ж пасля 4 верасня ўсё вернецца на кругі свае.**

*— Не вернецца, бо Ганцавічы ўжо іншыя. У скверы мы паставілі арэлі, дзеці там тоўпяцца, на лаўках сядзяць людзі і адпачываюць, а раней гэтага не было. Чалавек цягнецца да прыгожага.*

**— Уладзімір Міхайлавіч, вы — вялікі аптыміст. Лаўкі ў скверы прыгожыя, і альтанка беленькая... Але ці надоўга гэта?**

*— А ў нас выбару няма. Нехта, вядома, можа шкоду зрабіць (як кажуць, сям'я не без вырадка), але мы павінны прывучаць, навязваць сваё бачанне свету праз прыгожае, культуру... Пасля свята наступаюць будні, і таму мы будзем працаваць, клапаціцца пра дабрабыт, ствараць новыя працоўныя месцы, зберагаць для нашчадкаў спадчыну і на ёй выхоўваць дзяцей.*

Пасля размовы мы прайшліся па цэнтры горада. Паўсюдна будаўнікі накладвалі «апошнія штрыхі», а каля крамы «Кветкі» выцягнулася чарга: дзеці ідуць у школу. Спадзяваўся ўбачыць бюст Якуба Коласа, але на пастаменце яго не было: скульптары паабяцалі ўстанавіць напярэдадні свята. Напэўна, так і будзе.

Як непазнавальна за гады незалежнасці змяніліся нашы райцэнтры! Якімі за савецкім часам былі Пружаны, Слуцк, Нясвіж, Навагрудак, Шклоў, Бяроза — і якімі яны сталі сёння! Будзем цаніць і абараняць свой суверэнітэт. А Дні беларускага пісьменства ўдыхаюць у нашы райцэнтры душу. На тое і задуманы.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.**
*г. Ганцавічы.*

**Погляд эксперта**

## Міхаіл КАВАЛЁЎ:

# «Прынятыя захады могуць стабілізаваць сітуацыю на валютным рынку»

Пасля нарады па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны «Звязда» звярнулася па каментар да **дэкана эканамічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта прафесара Міхаіла КАВАЛЁВА.**

**— Якія наступствы будзе мець адкрыццё дадатковай сесіі таргоў на валютнай біржы?**

— Адкрыццё дадатковай сесіі — правільны крок. Замест шматлікіх курсаў і паўпадпольных рынкаў валюты мы атрымліваем продаж валюты ў адным месцы. І гэта вельмі станоўча. Мне здаецца, што на час да стабілізацыі курса трэба ўвогуле сканцэнтраваць абсалютна ўсе здзелкі па продажы валюты на гэтай дадатковай сесіі. Вынікам будзе празрыстасць, адсутнасць парушэнняў і адзіны курс.

Аднак сказаць сёння, што ўсе праблемы вырашаны, нельга. Вырашаны толькі праблемы празрыстасці, зручнасці работы для імпарцёраў і экспарцёраў. Дэфіцыт гандлёвага балансу па-ранейшаму застаецца: нашага экспарту, які сёлета значна вырас, хапае толькі на закупку прамежкавага імпарту. Гэта значыць, што калі нават экспарцёры прывязуць усю, да капейкі, заробленую валюту ў краіну, гэтага хопіць толькі на закупкі прамежкавых матэрыялаў, сыравіны і іншага. А яшчэ ж ёсць спажывецкі імпарт. Як ні павялічыліся цэны на імпартныя спажывецкія тавары, мы ўсё роўна тое-сёе з прадуктаў імпартных купляем, адзенне тое ж. Таксама ёсць інвестыцыйны імпарт. І таму праблема адзінага курсу ў нейкай ступені вырашана. А праблема дастатковасці валюты для функцыянавання эканомікі — не.

**— А як яе вырашыць?**

— Трэба знайсці дадатковыя крыніцы. Зразумела, што экспарт будзе працягваць расці, будзе меншы імпарт спажывецкіх тавараў. Сітуацыя будзе паляпшацца, але нават пры гэтым краіне для нармальнага функцыянавання эканомікі не хапае мінімум два-тры мільярды долараў. Таму трэба ці закладваць золата з золатавалютных рэзерваў, ці прадаваць яго ж. Але, на мой погляд, аптымальны спосаб — гэта паскарэнне прыватызацыі. Можа быць, нават не столькі буйных аб'ектаў («Белтрансгаза», «Беларуськалія», напрыклад), бо зразумела, што тут будуць карыстацца сітуацыяй і імкнуцца купіць нашы акцыі танна. Мне здаецца, што трэба паскорыць масавую прыватызацыю сярэдніх аб'ектаў, што дало б дадатковы прыток замежных і ўнутраных доларавых інвестыцый, каб закрыць патрэбныя два-тры мільярды. А можа быць, атрымаем дадатковы крэдыт ад МВФ. Але яшчэ раз падкрэсліваю, што калі не будуць знойдзены дадатковыя крыніцы валюты, то эйфарыя, якую выказвалі многія прамыслоўцы, пакуль дачасная. Таму што валюты на біржы не будзе хапаць для ўсіх імпарцёраў, а значыць, курс будзе павялічвацца, і пступова некаторыя, магчыма і горадаўтваральныя прадпрыемствы, пачнуць «адвальвацца». У іх проста не будзе грошай, каб купляць валюту па дзевяць-дзесяць тысяч. Вядома, што рынак стабілізуе ўсё, але ў нашай сітуацыі гэта можа быць вельмі дарагой цаной, калі адзін з нашых заводаў не зможа закупіць камплектуючыя альбо купіць па такой высокай цане, што ў яго не застанецца грошай, каб выплаціць зарплату сваім работнікам. А абавязковая ўмова стабілізацыі курсу і выхаду на адзіны курс — гэта адсутнасць эмісіі. Эмісіі няма — значыць, прадпрыемства прыходзіць і кажа: «Дайце мне грошай, бо няма чым плаціць зарплату», а яму кажуць: «Прабачце, грошай няма». Таму курс можна стабілізаваць, але ў нашых умовах збалансаванасці экспарту толькі з прамежкавым імпартам абавязкова патрэбны інтэрвенцыі Нацыянальнага банка. А для гэтага патрэбны ці крэдыты, ці продаж дзяржмаёмасці.

**— Прэзідэнт пра гэта і казаў: «Ніякай эмісіі». Але як пасля гэтага будзе прадпрыемствам?**

— Прадпрыемствам будзе цяжэй, таму што яны будуць дорага купляць валюту. У былой сітуацыі яны маглі б пайсці і сказаць: «Дайце нам крэдыт». Але сёння браць крэдыт з такой стаўкай рэфінансавання — гэта банкруцтва для прадпрыемства. Рынак, зразумела, вызначыць раўнаважны курс, але пры гэтым курсе занадта шмат прадпрыемстваў могуць стаць неплацежаздольнымі. Да гэтага трэба быць гатовымі. Таму цалкам без эмісіі мы, напэўна, не абыдземся. Значыць, трэба яшчэ дзесьці шукаць плюс да тых двух-трох мільярдаў долараў, пра якія я ўжо казаў, яшчэ валюту на пакрыццё эмісіі.

**— А што наконт сістэмы электроннага ўліку куплі валюты?**

— Электронны ўлік існуе ў многіх краінах свету. Мы ж улічваем крэдыты, якія выдаём. Як раз у гэтым рэгістры крэдытаў можна весці ўлік валюты, якую прадаюць. Але гэты захад эфектыўны ў краіне, дзе абсалютна ўсе грамадзяне законапаслухмяныя. У нашай жа сітуацыі баюся, што валютнаму спекулянту не будзе вялікай праблемы сабраць дзясятак пашпартоў у бедных студэнтаў альбо пенсіянераў і пайсці ў знаёмага банкіра купіць на ўсе гэтыя пашпарты валюту. Таму эфектыўнасць гэтага захаду невысокая. Але з часам, думаю, ён зможа сапраўды ўпарадкаваць рынак наяўнай валюты.

**— Людзям будзе дадзена магчымасць, калі яны захочуць, перавесці рублёвыя ўклады ў валютныя. Аднак даходнасць рублёвых укладаў зараз вельмі вялікая. Што рабіць людзям?**

— Я мяркую, што калі б Нацбанк рэкамендаваў банкам канвертаваць рублёвыя ўклады ў валютныя ў сакавіку, то паніка б імгненна знікла, як і некалькі гадоў таму, і валютнага крызісу ў нас увогуле не было б. Гэты захад вельмі правільны, але калі б ён быў ужыты ў сакавіку, многіх праблем сённяшніх мы б не мелі. Да таго ж, тады ў банкаў была лепшая валютная пазіцыя, і яны ў невялікіх аб'ёмах (і гэтага было б дастаткова) маглі зрабіць канвертацыю. Карацей, калі б ў сакавіку мы рэзка паднялі стаўку рэфінансавання па рублях і аб'явілі, што можна выбіраць: ці рублёвы пад 20 працэнтаў, ці валютны пад 8 працэнтаў, то для банкаў усё прайшло б беспраблемна. Зараз жа ўжо вялікага сэнсу мяняць рублі на долары няма пры такой дэпазітнай стаўцы па рублях. Да таго ж не ўсе банкі могуць зараз зрабіць свабодна гэтую працэдуру. Але нават цяпер гэта рэкамендацыя правільная. І яна накіравана перш за ўсё на тое, каб пагасіць дэвальвацыйныя чаканні і прыпыніць адток укладаў. Думаю, што ў комплексе з іншымі захадамі яна можа даць эфект. Але насельніцтва не будзе патрабаваць канвертацыі толькі ў тым выпадку, калі яно ўбачыць, што курс на дадатковай сесіі прыпыніўся ці нават рушыў уніз з таго, які зараз называецца курсам «чорнага рынку». І яшчэ: стабілізацыя курса залежыць ад Нацыянальнага банка, і ён павінен быць не толькі назіральнікам, як гэта было апошнія чатыры-пяць месяцаў, а актыўна ўплываць на валютныя працэсы.

**— А калі ўсё ж такі зможа ўсталявацца адзіны курс?**

— Падкрэслю, што пры рэалізацыі ўсіх азначаных захадаў і адшуканні дадатковай валюты для інтэрвенцыі сітуацыю можна будзе стабілізаваць хутка. І, дарэчы, яна будзе стабілізавана тым хутчэй, чым хутчэй курс абавязковага продажу мы пасунем у напрамку рынкавага. Пры гэтым трэба імкнуцца выдаткі гэтага працэсу перакласці на ўсіх эканамічных суб'ектаў больш-менш раўнамерна: на сярэдні клас, а не на малазабяспечаных, на экспарцёраў і імпарцёраў прыкладна ў аднолькавай ступені.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

# ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА ВЕРАСЕНЬ

**3 верасня.** Стрыгчы валасы непажадана.

**4 верасня.** Стрыжка валасоў можа пацягнуць за сабой канфлікты.

**5 верасня.** Стрыжка ў гэты дзень забяспечвае даўгалецце, добрае здароўе і зробіць ваша жыццё дастойным у вачах навакольных.

**6 верасня.** Стрыжка валасоў прыцягвае хваробы.

**7 верасня.** У гэты дзень рэкамендуецца ўстрымацца ад стрыжкі.

**8 верасня.** Спрыяльны дзень для стрыжкі валасоў.

**9 верасня.** Стрыгчы валасы нельга.

**10 верасня.** Спрыяльны дзень, разам з астрыжанымі кончыкамі вы пазбавіцеся ад усяго негатыву. Стрыжка ў гэты дзень дапамагае пазбавіцца ад праблем.

**11 верасня.** Стрыжка валасоў у гэты дзень спрыяльная.

**12 верасня.** Поўня — самы спрыяльны час для стрыжкі.

**13 верасня.** Ад стрыжкі лепш устрымацца.

**14 верасня.** Стрыжку валасоў пажадана адкласці на больш удалы дзень.

**15 верасня.** Неспрыяльны дзень для стрыжкі.

**16 верасня.** Можаце смела накіроўвацца да цырульніка, бо стрыжка ў гэты дзень падаўжае жыццё.

**17 верасня.** Стрыгчы валасы непажадана.

**18 верасня.** Спрыяльны дзень для стрыжкі валасоў.

**19 верасня.** Удалы дзень для паходу ў цырульню.

**20 верасня.** Стрыжка ў гэты дзень паляпшае дабрабыт.

**21 верасня.** Паказанні ў гэтага дня такія ж, як і напярэдадні.

**22 верасня.** Сёння ад стрыжкі лепш устрымацца.

**23 верасня.** Няўдалы дзень для наведвання цырульніка.

**24 верасня.** У выніку стрыжкі валасоў ці стварэння прычоскі вы прыцягнеце да сябе радасць і шчасце.

**25 верасня.** Спрыяльны дзень для стрыжкі.

**26 верасня.** Стрыжка дадасць вам прыцягальнасці, прыгажосці, вы будзеце падабацца людзям яшчэ больш.

**27 верасня.** Маладзік. У гэты дзень стрыгчыся забаронена.

**28 верасня.** Стрыгчы валасы не рэкамендуецца, паколькі гэта можа пацягнуць за сабой спрэчкі і канфлікты з блізкімі людзьмі.

**29 верасня.** Ісці да цырульніка ў гэты дзень непажадана, бо стрыжка можа пацягнуць за сабой сур'ёзныя растраты ў бліжэйшы час.

**30 верасня.** Стрыжка можа выклікаць дыскамфорт і тугу — лепш адкласці візіт да цырульніка.

**Падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

# НА АДХОДАХ МОЖНА ЗАРАБЛЯЦЬ ГРОШЫ?

**Сур'ёзна абмеркаваць праблему ўтылізацыі адходаў плануецца падчас «круглага стала», які пройдзе ў рамках трэцяй міжнароднай выставы «Recycling'11» напрыканцы верасня ў Мінску. Такая своеасаблівая пляцоўка для дыскусіі дапаможа выпрацаваць агульныя падыходы і абмяняцца меркаваннямі прадстаўнікам усіх зацікаўленых бакоў, лічыць Уладзімір ІСКАРЦАЎ, член аргкамітэта па правядзенні выставы «Recycling'11», намеснік дырэктара інвестыцыйнага агенцтва «Vladium».**

— Гэтая тэма вельмі вострая для нашай эканомікі, і нам трэба зрабіць максімальна зручным і прымальным праект указа Прэзідэнта краіны аб абыходжанні з адходамі, які зараз рыхтуецца. Аказваецца, няма адзінага падыходу і адзінага меркавання ў розных міністэрстваў на гэты конт, а таксама няма пляцоўкі, дзе яны маглі б сабрацца нефармальна і гэтыя праблемы абгрунтаваць.

Сапраўды, гаварыць пра ўтылізацыю і перапрацоўку адходаў вельмі важна. У гэтым перакананы таксама і Анатоль ЯЦУК, прадстаўнік СТАА «Зялёная кропка»:

— Узяць, напрыклад, батарэйкі — у свеце існуе 73 віды батарэек. Калі разбіваць па асобных тэхналогіях, то гэта значыць, што трэба стварыць 73 тэхналогіі па іх утылізацыі. Які шлях выбралі іншыя краіны? Кожная батарэйка мае нейкія каштоўныя кампаненты — металы. Іх драбняць і на металургічных камбінатах здабываюць гэтыя металы. Адзін кілаграм батарэек ідзе за некалькі тон руды.

Пры гэтым Анатоль Яцук перакананы, што да гэтай праблемы варта падыходзіць сістэмна:

— Калі не будзе залогавых цэн — не будзе і паўнавартаснага збору. Мы нічога цалкам не збіраем — ні макулатуру, ні ПЭТ-бутэлькі, ні батарэйкі. А паколькі не вылучаем перад утылізацыяй ці перапрацоўкай небяспечныя рэчывы з камунальных адходаў — значыць, апошнія таксама будзе складана перапрацоўваць. Нам трэба стварыць у рэспубліцы цэлую сістэму, і толькі тады мы пачнём зарабляць на адходах грошы, прычым вялікія.

**Іван СТУЖКА.**

## ПРАТРЫМАЦЦА ПЕРШЫЯ 10 ГАДОЎ

**Часцей за ўсё разводзяцца сямейныя пары, якія пражылі ў шлюбе 5-9 гадоў, паведамляе ЮНФПА ў Беларусі. Сярод беларускіх скасаваных шлюбаў найбольшая ўдзельная вага — каля 44 працэнтаў мужчын і столькі ж жанчын — прыпадае на ўзрост ад 25 да 34 гадоў.**

Сельскія сем'і больш устойлівыя. Летась на 1000 гараджан прыпадала 4,5 развода, у сельскай мясцовасці — 2,1. З агульнай колькасці тых, хто ўступае ў шлюб, каля 75 працэнтаў мужчын і столькі ж жанчын упершыню рэгіструюць шлюб. Кожны чацвёрты зарэгістраваны летась саюз быў паўторным. Узрост уступлення ў першы ці паўторны шлюб паступова павялічваецца.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ТРАЎМАВАНЫ СМЯРОТНА

Пры правядзенні работ на казловым кране смяротна траўмаваны 20-гадовы электрык аднаго з буйных гомельскіх прадпрыемстваў. Рабочы рамантаваў электраабсталяванне на вышыні 9 метраў. Як паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, цела загінулага з прыкметамі пашкоджання электрычным токам з вышыні здымалі выратавальнікі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ПАДРЫХТАВАЛІСЯ ДА ШКОЛЫ

Вучань Уваравіцкай школы Буда-Кашалёўскага раёна, які ўжо мае судзімасць за крадзеж, разам з непрацуючым раней судзімым сябрам залез у дом мясцовай жанчыны. Вылезлі са здабыткамі: ноўтбукам, мабільнікам і музычнымі дыскамі. Грамадзян затрымалі разам з рэчамі. Дзве дзяўчынкі, 13 і 15 гадоў, спакусіліся на флэш-карты. Пяць такіх прылад яны сцягнулі з гандлёвага месца ў буйным гандлёвым цэнтры Гомеля.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ХАЦЕЎ ДАПАМАГЧЫ...

Мужчына, які жыве ў прыватным доме па вул. Брэсцкай у Баранавічах, надумаў дапамагчы суседцы. Калі зайшоў да яе, то вырашыў найперш пакаштаваць груш. Сусед накіраваўся да дрэва — і наступіў на бляху, якой была прыкрыта глыбокая яма. У выніку падзення мужчына зламаў пазваночнік.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**


## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСОВ

**Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь извещает о проведении конкурсов по продаже принадлежащих Республике Беларусь акций открытых акционерных обществ.**
**Конкурсы состоятся 12 октября 2011 г. по адресу: г. Минск, переулок Краснозвездный, 12.**
**Организатор конкурсов – Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12.**

| № | Полное и сокращенное наименование, место нахождения акционерного общества | Размер уставного фонда, штук акций | Номинальная стоимость акции, рублей | Доля государства в уставном фонде, штук акций | Доля государства в уставном фонде, в % к УФ | Количество продаваемых акций, штук акций | Количество продаваемых акций, в % к УФ | Начальная цена продажи акций, рублей | Условия конкурса |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Открытое акционерное общество «Ремид» (ОАО «Ремид») 220038, г. Минск, пер. 1-й Твердый, 6 | 656 681 | 4850 | 328 341 | 50 | 98 502 | 15,0 | 1 050 000 000 | Предоставить открытому акционерному обществу «Ремид» в течение 6 месяцев с даты подписания договора купли-продажи акций заем под 1% годовых: нерезидентом Республики Беларусь – в сумме 70 тыс. долларов США; резидентом Республики Беларусь – в сумме 70 тыс. долларов США либо в сумме, эквивалентной 70 тыс. долларов США. |
| 2 | Открытое акционерное общество «Белорусское морское пароходство» (ОАО «Белорусское морское пароходство») 220006, г. Минск, ул. Денисовская, 9 | 910 600 | 4400 | 909 126 | 99,8 | 909 126 | 99,8 | 8 110 000 000 | Внести в уставный фонд открытого акционерного общества «Белорусское морское пароходство» в течение 1 года с даты подписания договора купли-продажи акций в виде вклада денежные средства: нерезидентом Республики Беларусь – в сумме 450 тыс. долларов США; резидентом Республики Беларусь – в сумме 450 тыс. долларов США либо в сумме, эквивалентной 450 тыс. долларов США. Обеспечить сохранение в течение 5 лет с даты подписания договора купли-продажи акций количества рабочих мест и профиля деятельности общества. Не допускать ухудшения социальных и материальных условий действующих трудовых договоров (контрактов) и коллективного договора в течение срока их действия. |
| 3 | Открытое акционерное общество «Гомельский авторемонтный завод» (ОАО «Гомельский АРЗ») 246028, г. Гомель, ул. Кирова, 123 | 1 199 657 | 4400 | 1 190 558 | 99,2 | 578 235 | 48,2 | 10 300 000 000 | Предоставить открытому акционерному обществу «Гомельский авторемонтный завод» в течение 1 года с даты подписания договора купли-продажи акций заем под 1% годовых: нерезидентом Республики Беларусь – в сумме 405 тыс. долларов США; резидентом Республики Беларусь – в сумме 405 тыс. долларов США либо в сумме, эквивалентной 405 тыс. долл. США. |
Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, составлен на основании данных реестра владельцев акций ОАО «Мотовело» по состоянию **на 01 сентября 2011 г.**

УНП 190017558

Жаночыя сакрэты

## 10 прычын НЕ худзець

**Мы толькі і чуем з усіх бакоў пра разнастайныя дыеты, захоўваць якія сёння стала хутчэй модна, чым карысна. Але хто сказаў, што худзізна да твару? Не ўсім жа хадзіць па подыуме, ды і ці трэба яно нам?**



### ПРЫЧЫНА 1. Перавагі поўных

Далёка не ўсім мужчынам падабаюцца далікатныя дамы. Моцная палова чалавецтва ведае, што паўнаватыя жанчыны практычна заўсёды з'яўляюцца цудоўнымі хатнімі гаспадынямі, яны таварыскія і маюць шырокае кола знаёмых. Яны па-свойму жаноцкія і сэксуальныя. Такія жанчыны — чулыя сябры і палюбоўніцы, уважлівыя суразмоўцы. Часта поўныя жанчыны даруюць здрады, яны неагрэсіўныя і рэдка бываюць раздражняльнымі. Таксама важна, што таўстушкі не проста любяць паесці, але і самі цудоўна гатуюць.

### ПРЫЧЫНА 2. Сытыя — значыць добрыя

Нездарма кажуць, што ежа — гэта наркотык. Які ён на смак — вырашае кожны сам: цукровы, макаронны, пернікавы і г.д. Гэты наркотык робіць нас больш шчаслівымі, таму што падчас яды ў нашым арганізме павышаецца ўзровень «гармонаў шчасця» — эндарфінаў. А вось калі нам нестае радасці, з'яўляюцца агрэсія і раздражняльнасць. Так галоднымі і злоснымі вачыма мы шукаем перад сабой, што б з'есці, выплюхваючы ўсю незадаволенасць на навакольных. Ну і скажыце, як такая асоба можа спадабацца мужчынам? А сябрам? А калі жанчына яшчэ і сядзіць на дыеце, то, без сумневу, асноўнай тэмай для гутарак стане ежа. Такі сумны суразмоўца далёка не ўсім цікавы, праўда ж?

### ПРЫЧЫНА 3. Цяжарнасць — не час для дыет

Падчас цяжарнасці трэба радавацца хуткаму з'яўленню дзіцяці на свет, паляпшэнню дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне і забіваць сабе галаву такімі рэчамі, як пялюшкі, распашонкі і памперсы. І ўжо ніяк не думкамі пра дыеты і галаданне.

### ПРЫЧЫНА 4. Нельга худзець пасля цяжарнасці

Нельга хутка худзець і пасля цяжарнасці. Нягледзячы на тое, што сусветна вядомыя мадэлі ўмудраюцца прыходзіць у форму пасля родаў за пару месяцаў, не варта браць з іх прыклад. Безумоўна, гэта аказвае сур'ёзны псіхалагічны ціск на многіх мам, якія зведваюць дэпрэсію з-за фігуры, распаўнелай пасля нараджэння дзіцяці. Ад таго, пахудзееце вы за два месяцы, паўгода або год, любіць вас менш ніхто не будзе. Як толькі закончыце карміць дзіця грудзьмі, тады пры жаданні і бярыцеся за дыеты і заняткі спортам. Прапаганда хуткага скідання вагі, набранай за час цяжарнасці, правакуе нас на ўчынкі, якія могуць нашкодзіць не толькі нашаму здароўю, але і здароўю немаўляці.

### ПРЫЧЫНА 5. Занадта худзенькія жанчыны не могуць зацяжараць

У чым жа сувязь паміж цяжарнасцю і худзізнай? Справа ў гармонах. Тлушчавая тканка цесна звязана з гарманальнай дзейнасцю арганізма. А гармоны, у сваю чаргу, уплываюць на зачацце і цяжарнасць. З недахопам тлушчавай тканкі ў жанчыны парушаецца менструальны цыкл, магчыма нават поўнае спыненне менструацыі да ўзнаўлення нармальнай вагі. Таксама медыкі гавораць, што ў вельмі худых дзяўчат узровень гармонаў настолькі нізкі, што яйцаклетка часам не здольная дасягнуць маткі і апладніцца.

### ПРЫЧЫНА 6. Змена памераў — змена гардэробу

Глабальнае пахудзенне можа магутна ўдарыць па вашым кашальку. Бо неабходна будзе купляць не толькі новы рамень, але і штаны, спадніцы. А таксама новую сподняю бялізну, таму што пры пахудзенні ў большасці жанчын змяняецца памер грудзей, і адгэтуль — новыя кашулі, майкі, блузкі і іншыя складнікі гардэроба. Вы ўсё яшчэ хочаце кардынальна пахудзець?

### ПРЫЧЫНА 7. Шоу таўстушак

Шоу таўстушак стала адной з самых папулярных і займальных праграм у многіх забаўляльных установах. Бары, клубы з радасцю сустракаюць жвавых і жыццярадасных паненак, здольных развесяліць і завесці любы натоўп. Такія праграмы таксама папулярныя на карпаратыўных мерапрыемствах і вечарынках. Калі гэта з'яўляецца вашай працай, навошта тады худзець?

### ПРЫЧЫНА 8. Узрост? Але маршчынкі не прыкметныя

Пакуль мы маладыя, маршчынкі не страшныя ні хударлявым, ні поўным. Але калі наш узрост пераступае рысу ў 35—40 гадоў, у таўстушак з'яўляецца важкая перавага. На іх твары павольней з'яўляюцца маршчынкі, а здаровы колер твару захоўваецца значна даўжэй. І гэта ўсім вядомы факт. Таксама ў большасці выпадкаў жанчыны з невялікім перавышэннем нормы вагі лягчэй пераносяць клімакс. Як толькі дамам стукне сорак, адразу ж пачынаюць дадавацца лішнія сантыметры на таліі і жываце. Гэтага можна не заўважыць адразу, бо павелічэнне тлушчавай масы ідзе адначасова са змяншэннем мышачнай. Аднак у гэтым узросце дыеты і фізічныя нагрузкі не заўсёды добрыя, таму што могуць справакаваць пагаршэнне самаадчування і прыбаўленне ў вазе.

### ПРЫЧЫНА 9. Вам не дазваляе стан здароўя

Пахудзенне — складаны працэс. Пазбаўляцца ад лішняй вагі нават чалавеку з моцным здароўем трэба асцярожна. Калі ваша вага больш за норму кілаграм на 20, то худзець трэба абавязкова, але пад наглядам доктара. Не выключана, што магчымасць паказацца спецыялісту ёсць не ў кожнай з нас. Рабіце выснову неадкладна — са зніжэннем залішняй масы варта пачакаць да лепшых часоў. Інакш пасля неабдуманых дыет давядзецца яшчэ не раз наведвацца да ўрача з новымі болькамі.

### ПРЫЧЫНА 10. Калі ўсё ў парадку

Навошта мучыць сябе дыетамі і абмежаваннямі ў ежы, калі ваш знешні выгляд і вага вас цалкам задавальняюць? Не варта паддавацца на правакацыю і гнацца за модай на дыеты. Гледзячы на сябе ў люстэрка, часцей усміхайцеся, рабіце сабе кампліменты, павышайце самаацэнку. Псіхолагі гавораць, што самы лепшы сябар сабе — гэта ты сам. І не забывайце: добрага чалавека павінна быць шмат. Вядома ж, мы не заклікаем набраць цэнтнер вагі і пакутаваць ад задышкі, але лішнія 5—6 кг — гэта нармальна.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

Дарэчы

### БРЫТАНСКІЯ СМІ ПАДТРЫМАЛІ ПОЎНЫХ ЖАНЧЫН

У гандлёвай сетцы краіны з'явіўся ў продажы часопіс Beautiful, выпушчаны спецыяльна для дам з пышнымі формамі.

На думку рэдакцыі, часопіс закліканы аднавіць здаровую самаацэнку ў поўных жанчын, парушаную традыцыйнымі жаночымі выданнямі, якія прапагандуюць худзізну як ідэал жаночай прыгажосці. У часопісе прынцыпова не здымаюць мадэляў з памерам адзення менш за 12-ы (50-ы па нашых стандартах). У ім таксама няма артыкулаў пры дыеты і зніжэнне вагі.

Супрацоўнікі рэдакцыі спадзяюцца, што іх прадукт будзе карыстацца попытам, паколькі ў Вялікабрытаніі шмат поўных жанчын. Акрамя таго, гэта адно з рэдкіх выданняў, у якім могуць рэкламавацца шматлікія кампаніі, што вырабляюць адзенне буйных памераў.

## Злоўжыванне антыбіётыкамі можа выклікаць атлусценне ў дзяцей

**Злоўжыванне антыбіётыкамі прыводзіць не толькі да з'яўлення супербактэрый, устойлівых да большасці лякарстваў, але і знішчэння карыснай мікрафлоры кішэчніка, а таксама можа выклікаць атлусценне ў дзяцей. Такую думку выказаў мікрабіёлаг з Нью-Ёркскага ўніверсітэта (ЗША) Марцін Блейзер, паведамляюць інфармагенцтвы.**

Блейзер лічыць, што пастаяннае выкарыстанне невялікіх доз антыбіётыкаў для лячэння дзіцячых інфекцый можа прывесці да атлусцення. Такі эфект лякарстваў выкарыстоўваецца ў жывёлагадоўлі для хуткага набору масы. Спецыяліст лічыць, што антыбіётыкі сталі прычынай практычна поўнага знікнення аднаго з відаў кішэчных бактэрый — Helicobacter pylori. У пачатку 20 стагоддзя гэта бактэрыя прысутнічала ў кішэчніку практычна ўсіх людзей. Да пачатку 21 стагоддзя яна сустракаецца толькі ў 6 працэнтаў жыхароў зямнога шара. Знішчэнне гэтага віду кішэчнай бактэрыі прыводзіць да змяненняў у выпрацоўцы гармонаў, якія кіруюць работай слізістай абалонкі страўніка. Марцін Блейзер лічыць, што гэтыя змяненні могуць прывесці да з'яўлення павышанай адчувальнасці да захворванняў страўнікава-кішачнага тракта.

Спецыяліст лічыць, што неабходна значна скараціць прыём антыбіётыкаў сярод дзяцей і цяжарных жанчын. Таксама сітуацыю могуць палепшыць прабіётыкі — прэпараты, якія аднаўляюць папуляцыю карысных бактэрый.

Пяць на пяць

# 5 кніг, якія павінен прачытаць кожны беларус

### (5 суб'ектыўных меркаванняў)

**Усённяшняй супярэчлівай і хуткаплыннай рэчаіснасці, багата аздобленай новымі тэхналогіямі і чалавечым прагматызмам, інфантылізмам і жаданнем рабіць усё лягчэй і хутчэй, вельмі цяжка знайсці месца для нечага сапраўднага. Для харчавання без Е і кансервантаў, для музыкі на «вінілах» ці хоць бы CD-дысках, для кнігі. Не электроннай кнігі ці камп'ютарнага файла на «ай-подзе», а кнігі сапраўднай, якую можна ўзяць у рукі, з характэрным пахам свежай паліграфічнай фарбы кніжных старонак, з ілюстрацыямі і аўтографамі аўтараў. Тым больш не часта ў нас знаходзіцца час для таго, каб асэнсаваць тое, што прачыталі... Але заўжды ёсць людзі, для якіх кніга — частка жыцця, інтымны сябра і дарадчык. Хочацца, каб такіх людзей станавілася больш, але не буду ствараць ілюзій. Зрэшты, для лянівых сёння ёсць аўдыякнігі. Ёсць нават экранізацыі літаратурных твораў, якія, безумоўна, не параўнаць з арыгіналамі хоць бы таму, што слова перадаць сродкамі візуальнага мастацтва амаль немагчыма.**

**З-за таго, што сучаснасць прапануе багаты выбар усяго, якасць гэтага ўсяго значна знізілася. І для таго, каб адшукаць сапраўднае — трэба добра пакорпацца ў «маскульце» і «папсе». Для гэтага трэба мець не толькі жаданне знайсці, але і шмат часу. «Звязда» вырашыла палегчыць вам задачу — параіць якасныя кнігі пра вечнае, якія абавязкова павінен прачытаць кожны беларус. Дапамагаць у гэтым вам будуць, вядома, творчыя людзі. Некаторыя з іх самі пішуць, а некаторыя актыўна чытаюць — гэта драматург, дызайнер, паэтка, спявачка (вакалістка папулярнага сярод моладзі гурта «Indiga») і мастак. У іх розныя погляды на літаратуру і на жыццё. Але яднае іх жаданне ведаць праўду пра гэтае жыццё, жаданне аналізаваць рэчаіснасць і змяняць нешта ў лепшы бок. Таму і кнігі яны выбралі адпаведныя. Чытайце!**

**Аляксей ДУДАРАЎ, драматург:**

**1. Біблія.** Гэта першая і асноўная кніга. Таму што там ёсць усё. І кожны свядомы чалавек павінен яе прачытаць. Справа не ў тым, атэіст ты ці вернік, праваслаўны атэіст ці яшчэ нехта, але ў тым, што кожны чалавек, які сябе адчувае «гомасапіенсам», павінен гэтую кнігу прачытаць. Вядома, можна назваць асноўныя кнігі і іншых рэлігій: Каран, Тора і інш., таму што Беларусь шматканфесійная дзяржава. Але калі выбіраць з усіх, то я выбіраю Біблію.

**2. Збор твораў Янкі Купалы.** Таму што гэта геній, па-першае. А па-другое, гэта творца, які найбольш выказаў тое, кім мы, беларусы, з'яўляемся.

**3. Збор твораў Якуба Коласа.** Колас больш прыземлены за Купалу. І калі казаць метафарычна, то Купала — гэта «мы-дух», а Колас — гэта «мы-плоць». Кожны чалавек складаецца і з таго, і з другога. Таму Якуба Коласа беларусам трэба чытаць абавязкова!



**4. Збор твораў Антона Чэхава.** Тут можна выбіраць самім, які канкрэтна твор чытаць. А лепш — усе. Бо ў Чэхава няма ні лепшых твораў, ні найлепшых, ні горшых — ён усюды Чэхаў. Я гэтаму творцу дзіўлюся — ён пра чалавека ведаў і сказаў усё. І пра адносіны, і пра грамадства. Лепшага творцы, чым Антон Паўлавіч, для мяне няма. Калі маеш яго кнігі, то не засумуеш, будзе пра што паразважаць. У яго творах і вобразах кожны чалавек заўжды знойдзе сябе, кім бы ён ні быў: беларусам, рускім, палякам, амерыканцам... Чалавек застаецца заўсёды чалавекам.

**5. Збор твораў Аляксандра Пушкіна.** У Пушкіна таксама ёсць усё, але галоўнае — узнёсласць, захапленне ад радасці быцця, жыцця, кахання. Як і ў Чэхава — у яго кожны радок геніяльны. Ён не пісаў, а спяваў, душой пакутаваў за тое, пра што спяваў.

**Дзмітрый СУРСКІ, старшыня Беларускага саюза дызайнераў:**

**1. Біблія, Каран, Тора.** Духоўныя кнігі, якія адпавядаюць асноўным чалавечым каштоўнасцям. Наша дзяржава шматканфесійная, таму называю некалькі кніг — кожнаму па веры яго.

**2. «Каласы пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча.** Кніга, якая ўдакладняе, акрэслівае і ўздымае нацыянальную самасвядомасць.

**3. «Лаліта» Уладзіміра Набокава.** Кожны чалавек у сваім жыцці павінен прачытаць хоць бы адну кнігу пра галоўнае ў жыцці, пра самае істотнае — пра каханне. Для мяне такая кніга — «Лаліта» Уладзіміра Набокава.



**4. «100 год адзіноты» Габрыэля Гарсія Маркеса.** Кніга, напісаная даўно, адпавядае нашай сучаснасці. Гэта калька з нашай рэчаіснасці. Маркеса трэба прачытаць, каб лепш яе зразумець.

**5. «Начевала тучка золотая» Анатоля Прыстаўкіна.** Кніга рускага пісьменніка-гуманіста, пра якую, напэўна, амаль усе забыліся ўжо... Думаю, чалавеку важна чытаць тыя кнігі, якія ў ім абуджаюць нейкія эмоцыі, прымушаюць плакаць, ачышчаюць яго. Гэта кніга была напісана ў 1950—1960-я гг., але выйшла ў свет толькі ў гады перабудовы (у 1988 годзе). У сваім жыцці я плакаў усяго ад трох кніг: «Каштанка» Чэхава, «Му-му» Тургенева і ад гэтай кнігі Прыстаўкіна. Я рыдаў бессаромна, пакутаваў за героя і адчуваў нейкае ачышчэнне адначасова.

**Віка ТРЭНАС, паэтка:**

На мой погляд, беларусы павінны прачытаць нашмат больш за пяць кніг. Таму мае літаратурныя захапленні не ўкладаюцца ў гэтую магічную лічбу. Аднак паспрабуем...

**1. Біблія.**

Духоўнасць і душэўнасць па-ранейшаму актуальныя, а паколькі, як вядома, усё пачалося са Слова, то і ў XXI стагоддзі Біблія застаецца Кнігай Жыцця. Па вялікім рахунку, не важна, на якой мове вы будзеце яе чытаць. Калі на беларускай — тым больш багатым станецца ваш асабісты свет. Не істотна, ці зразумееце вы ўсё, сказанае ў Бібліі, адразу, ці будзеце спасцігаць схаваныя ў ёй таямніцы мудрасці вельмі доўгі час. Вашае веравызнанне таксама не мае



значэння, бо галоўнае — сама сутнасць, сам працэс мыслення. Праўду кажуць: «Век жыві — век вучыся» .

**2. Уладзімір Караткевіч «Каласы пад сярпом тваім».**

Маючы сантымент да твораў Караткевіча ўвогуле, не магу абмежавацца адной назвай. Хочацца падзяліцца таксама сваёй радасцю ад чытання (дакладней нават — перачытвання) раманаў «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», «Чорны замак Альшанскі». Галоўнае — не ставіцца да асэнсавання твораў, унесеных у школьную праграму, як да фармальнасці. Любая нацыянальная культура трымаецца на класіцы. У розным узросце той ці іншы твор успрымаецца шматаспектна, шматузроўнева. Неарамантызм, гістарычнасць, эмацыйнасць, захопленасць лепшымі еўрапейскімі літаратурнымі традыцыямі ў прозе Караткевіча не пакіне абыякавым ні падлетка, ні сталага чытача.

**3. Іван Мележ, трылогія «Палеская хроніка».**

Многія школьнікі карыстаюцца кароткім зместам твораў. Дарма. Проза Івана Мележа — узор эпічнага мыслення. Нават калі не ўздымаць пытання пра вялізны гістарычны пласт, асэнсаваны пісьменнікам, і пра значнасць гэтай сацыяльнай рэфлексіі для нашага народа, можна захапіцца адно толькі мележаўскімі мовай і стылем.

**4. Янка Брыль «Птушкі і гнёзды».**

Ваенная тэматыка ў беларускай літаратуры прадстаўлена надзвычай шырока. Адзін з лепшых майстроў прозы, калі можна так выказацца, лірык у прозе, Янка Брыль не толькі фактаграфічны і псіхалагічна дакладны. Ён тонка эмацыйны, пранізлівы. Такі мастацкі кірунак, як рэалізм, для мяне найбольш гарманічна ўвасоблены ў творчасці Івана Антонавіча.

**5. Васіль Быкаў «Доўгая дарога дадому».**

Пастфактум творчасці пісьменніка падштурхоўвае да сур'ёзных роздумаў. Беларусы, якія нарадзіліся ў канцы васьмідзясятых—пачатку дзевяностых, знойдуць у гэтай кнізе многае, што дапаможа ім зразумець час маладосці іх бацькоў і сутнасць тагачаснага грамадства. Толькі параўнаўшы мінулае і сучаснасць, варта думаць пра будучыню.

**Руся, спявачка:**

**1. Уладзімір Пелевін «Чапаев и Пустота».**

Пелевін, на маю думку, філосаф постсавецкай сучаснасці. Калі нас не стане і іншапланетныя цывілізацыі будуць кор



пацца ў рэштках літаратурных помнікаў чалавецтва, хай ім пашанцуе знайсці кнігі Пелевіна, бо менавіта яны лепш за ўсё здольныя распавесці пра «складаную душу» постсавецкага чалавека. «Чапаев і Пустота» дапаможа вам крыху разабрацца са сваімі «загонамі», вырашыць некаторыя пытанні ўнутраных хістанняў, экзістэнцыйных пошукаў і існавання ў некалькіх светах адначасова.

**2. Міларад Павіч «Хазарскі слоўнік».**

Гэтая кніга незвычайна чароўнай прыгажосці. Раю яе ў якасці антыцынічнай тэрапіі. Нават самы рацыянальны чытач вельмі хутка адчуе, што мудрагелістыя гісторыі Павіча ўжо праглынулі яго і ва ўспрыманні рэчаіснасці нешта змянілася. «Хазарскі слоўнік» верне вам здольнасць фантазіраваць і нараджаць у розуме нечаканыя гісторыі і вобразы. Абяцаю вам захапленне!

**3. Мішэль Фуко «Наглядаць і караць».**

(Арыгінальная назва — «Surveiller et punir: Naissance de la prison»). Гэтая кніга дапаможа зразумець, чаму чалавечае жыццё так часта нагадвае турму, чаму гільяціна сярэднявечча, на думку Фуко, больш гуманная, чым сістэма дысцыплінарнай улады, як вамі карыстаецца сістэма і як у побыце працуе канцэпцыя «вялікага брата» .

**4. Альбер Камю «Чужаніца».**

(У перакладзе Змітра Коласа). Акрамя «Чужаніцы», сюды ўвайшлі аповесць «Падзенне» і некалькі апавяданняў. Мова перакладу захапляе сваёй сакавітасцю і прафесіяналізмам. Мне асабіста падчас чытання прыйшлося часта звяртацца да слоўніка роднай мовы. Самі ж творы ўпэўняць вас у тым, што быць чалавекам — значыць проста быць чалавекам, што не варта баяцца сябе і адчування таго, што вы чужы ўсім і ўсяму. Жыццё часта не спраўляецца з прынятай мараллю, і гэта нармальна. Творы Камю надзвычайна інтымныя.

**5. Джэром Сэлінджэр «Лавец у жыце».**

(Арыгінальная назва «The Catcher in the Rye»). Пошукі падлетка ў дарослым жыцці нагадаюць вам пра тое, што кожны з нас застаецца крыху дзіцяткам са сваімі чаканнямі, страхамі, расчараваннямі, смеласцю і рашучасцю супраціву лжываму свету дарослых. Калі вы хочаце абудзіць свайго ўнутранага дзіцёнка — чытайце Сэлінджэра. Ды й увогуле чытайце добрыя кнігі.

**Юрый ПІСКУН, мастак:**



**1. Новы Запавет.** Ён, дарэчы, ёсць у перакладзе на беларускую мову. Якраз гэтую кнігу важна прачытаць у маладым узросце. Там вы знойдзеце акумуляцыю ўсёй маральнасці і духоўнасці.

**2. «Сотнікаў» Васіля Быкава.** Я заўжды захапляўся творчасцю гэтага пісьменніка. Яна спрыяльна ўплывае на станаўленне беларускай самасвядомасці. У творах Быкава ёсць вялікая праўда пра жыццё. У маладосці Сотнікаў, шчыра кажучы, быў маім ідэалам.

**3. «Вянок» Максіма Багдановіча.** Мне вельмі падабаецца яго паэзія. Гэта вельмі прыгожае пісьменства. Але можна пачытаць і яго крытыку, яго эсэ, таксама працятыя беларускім духам, высокай адукаванасцю.

**4. «Новая зямля» Якуба Коласа.** Некалі я ведаў усю гэтую паэму на памяць. У ёй — наша гісторыя, характары, прырода, квінтэсэнцыя беларускай ментальнасці. Аднойчы я быў у Барселоне ў творчай камандзіроўцы, і адзін знакаміты каталонскі паэт папрасіў пачытаць мяне што-небудзь па-беларуску. Я прачытаў урывак з «Новай зямлі». І ён сказаў, не зразумеўшы сэнсу, што наша мова вельмі прыгожая, мілагучная. Вось каб сэрцам адчуваць мелодыку беларускай мовы —таксама трэба пачытаць Коласа.

**5. «Дзікае паляванне караля Стаха» Уладзіміра Караткевіча.** Цудоўны твор. У захапляльнай лёгкай форме распавядаецца пра нашу гісторыю, пра спрадвечныя праблемы і боль беларусаў. Асабліваю раю пачытаць гэтую кнігу маладым беларусам. Мяне ў свой час яна вельмі захапіла!

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

---

Наш культурны асяродак

# Жырандоля

Выпуск № 7 (123)

Жамчужыны Айчыны

## НОВАЕ ЖЫЦЦЁ АЎГУСТОЎСКАГА КАНАЛА?

### Інвестарам прапануюцца вялікія льготы

**ТРЭЦЯГА верасня ўступае ў сілу Указ Прэзідэнта Беларусі № 220 «Аб стварэнні спецыяльнага турысцка-рэкрэацыйнага парка «Аўгустоўскі канал» — першага праекта падобнага кшталту ў нашай краіне. Згодна з гэтым дакументам, на зону беларускай часткі канала (а гэта 5749,88 гектара), па сутнасці, распаўсюджваюцца «правілы гульні» ў свабоднай эканамічнай зоне. І менавіта на адміністрацыю СЭЗ «Гроднаінвест» з яе ўжо дзевяцігадовым вопытам працы з айчыннымі і замежнымі інвестарамі ўскладзены функцыі і правы па кіраванні паркам.**

**Карэспандэнт «Звязды» пацікавіўся ў кіраўніка адміністрацыі СЭЗ «Гроднаінвест» Сяргея ТКАЧЭНКІ, у чым жа прынцыповае адрозненне гэтага праекта ад ранейшых, што прымаліся па развіцці беларускай часткі Аўгустоўскага канала.**



— У папярэдніх праграмах упор рабіўся найперш на цэнтралізаваныя рэсурсы з рэспубліканскага, мясцовых бюджэтаў. Было зроблена шмат, і галоўнае — па рэканструкцыі, у інжынерным плане, дзякуючы чаму сталі магчымымі наступныя праекты. Але цяпер у мэтах развіцця турыстычнай індустрыі і інфраструктуры, што прылягае да беларускай часткі Аўгустоўскага канала, ставіцца задача задзейнічаць іншыя крыніцы фінансавання, зацікавіць і айчынны, і замежны бізнэс у тым, каб было выгадна інвеставаць менавіта сюды, а не ў суседнія краіны. А для гэтага трэба стварыць прыцягальныя ўмовы з пункту гледжання эканомікі, гарантый на ўрадавым узроўні. Таму і ўзнікла ідэя выкарыстаць у парку «Аўгустоўскі канал» той вопыт, які ўжо напрацаваны ў свабоднай эканамічнай зоне «Гроднаінвест».

Усе прадугледжаныя прэзідэнцкім Указам дакументы ўрада, міністэрстваў і ведамстваў, мясцовых органаў улады практычна падрыхтаваны. Ужо з першых чысла́ў верасня мы гатовы да разгляду інвестыцыйных прапаноў.

***— Якія ж прэферэнцыі прапануюцца інвестарам у парку «Аўгустоўскі канал»?***

— Указам кіраўніка дзяржавы вызначана, што турысцка-рэкрэацыйны парк «Аўгустоўскі канал» ствараецца на 20 гадоў. Пры заяўленым аб'ёме інвестыцый у суме не менш за 200 тысяч еўра рэзідэнты парка вызваляюцца ад падатку на прыбытак, які імі атрыманы ад рэалізацыі тавараў (работ, паслуг) уласнай вытворчасці. Гэты льготны рэжым дзейнічае на працягу пяці каляндарных гадоў, прычым адлік ідзе не з моманту рэгістрацыі суб'екта гаспадарання ў парку, а пачынаючы з атрымання ім валавога прыбытку. А пасля пяцігадовага перыяду прыбытак рэзідэнтаў парка абкладаецца на 50 працэнтаў ад стаўкі, што ўстаноўлена заканадаўствам.

Акрамя таго, не трэба плаціць падатак на нерухомасць па размешчаных на тэрыторыі парка будынках і збудаваннях, падатак на дабаўленую вартасць з абароту па рэалізацыі ўласных тавараў і паслуг на тэрыторыі Беларусі. Рэзідэнты парка таксама вызваляюцца ад увазных мытных пошлін і ПДВ пры ўвозе тэхналагічнага абсталявання, камплектуючых і запчастак да яго, сыравіны і матэрыялаў у мэтах рэалізацыі інвестыцыйных праектаў у межах парка «Аўгустоўскі канал». Прадугледжаны і іншыя льготы.



***— Яны тычацца тых, хто ўжо распачаў бізнэс ў зоне Аўгустоўскага канала?***

— Каб атрымаць спецыяльны прававы рэжым працы, трэба зарэгістравацца рэзідэнтам парка «Аўгустоўскі канал». Пасля гэтага, калі заяўлены інвестыцыйны праект і ён адпавядае неабходным крытэрыям, ідзе «кропка адліку» і для адпаведных прэферэнцый.

***— Колькі часу могуць заняць падрыхтоўчыя працэдуры для таго ці іншага праекта?***

— Сапраўды, заўсёды, акрамя заканадаўства, ёсць праблемы, якія трэба вырашаць у рабочым парадку. І калі чалавек застаецца з імі сам-насам, не ведаючы адметнасці, так бы мовіць, менталітэту таго ці іншага рэгіёна, то гэта зацягвае рэалізацыю, а часам і губіць праект. Таму адна з асноўных задач адміністрацыі СЭЗ «Гроднаінвест» у тым, каб прадстаўляць і адстойваць інтарэсы рэзідэнтаў парка «Аўгустоўскі канал» у дзяржаўных і іншых органах. Мы з'яўляемся своеасаблівым штабам для людзей, які прыйдуць з інвестыцыйным праектам. З іншага боку, у прэзідэнцкім Указе прапісана, што адміністрацыя СЭЗ з'яўляецца органам кіравання на тэрыторыі парка. Гэта таксама стварае ўмовы, каб зрабіць вырашэнне розных працэдурных пытанняў максімальна спрыяльным для інвестара. Мы ведаем, як гэта рабіць.

Калі адказны інвестар, то, безумоўна, усё будзе вырашацца вельмі хутка: паралельна ідзе рэалізацыя інвестыцыйнага праекта з яго боку і стварэнне інфраструктуры пад гэты аб'ект — з нашага. Як і павінна быць пры ўзаемавыгадным партнёрстве дзяржавы і прыватнага бізнэсу.

Акрамя таго, наша задача ў тым, каб па максімуме выкарыстаць патэнцыял трансгранічнага супрацоўніцтва, наладзіць транспартныя патокі. Будзем ставіць і пытанні ўдасканалення тых, што існуюць, а таксама адкрыцця ў зоне Аўгустоўскага канала новых памежных пераходаў. Пры гэтым не дапусціўшы пераўтварэння гэтай тэрыторыі ў нейкі кангламерат урбанізацыі, захаваўшы яе ўнікальную прыроду і экалогію.

***— Калі разлічваеце на першыя вынікі новай эканамічнай палітыкі ў зоне Аўгустоўскага канала?***

— Ужо ёсць даволі цікавыя прапановы, якія тычацца арганізацыі турындустрыі, гасцінічнага, рэстараннага бізнэсу, спартыўных мерапрыемстваў, аздараўлення людзей. Мяркую, што ўжо сёлета ў парку «Аўгустоўскі канал» будзе зарэгістравана некалькі рэзідэнтаў і праектаў, а налета зможам на свае вочы ўбачыць шэраг аб'ектаў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
**Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.**

---

Погляд

## «САКРЭТНЫЯ» МАТЭРЫЯЛЫ, НЕВЯДОМЫЯ АЎТАРЫ

**НЕЯК уранні завіхаўся на кухні, пачуў па радыё песню, у якой былі словы: «Затрымай мяне сонечнымі цёплымі праменямі...» Падумалася: нейкая новая спявачка, і словы песні прыгожыя. Навастрыў вушы, каб пачуць яе прозвішча. Але, на жаль, ні прозвішча выканаўцы, ні аўтараў тэксту і музыкі не аб'явілі.**

**— Чорт пабірай! — усклікнуў я, як і героі Караткевіча. — Што за гульня ў хованкі? Гэта ж непавага да маладых талентаў.**

**Не паспеў так падумаць, як Павел Лазовік прыемным голасам абвясціў:**

**— Патэлефанаваў слухач. Пытаецца, хто спяваў гэтую песню. Дык вось, песню выконваў беларускі гурт «Аўра».**

**У Паўлавым голасе пачуліся няёмкасць — ён разумеў, што адказ даў няпоўны: слухача цікавіла прозвішча выканаўцы, а ён, вядучы перадачы, і сам гэтага не ведае.**

**Давялося мне адсунуць убок усе справы і сесці за стол. Паспрыяла нараджэнню гэтага допісу і неспадзяваная сустрэча. Але пра яе потым.**

❑ ❑ ❑

Спытайцеся на вуліцы ў дзесяці ці дваццаці чалавек, ці ведаюць яны песню «Рэха жураўлінае», і ў адказ пачуеце: «Так, ведаем. Песня выдатная. Паліна Смолава атрымала за яе Гран-пры на «Славянскім базары». Але аўтара тэксту гэтай песні, упэўнены, не назаве ніхто. Не ведаюць людзі сваіх паэтаў. Ды адкуль ім ведаць, калі іх прозвішчы апошнім часам зусім не аб'яўляюцца?

А ў нас ёсць выдатныя паэты-песеннікі: Алесь Бадак, Леанід Дранько-Майсюк, Уладзімір Мазго, Віктар Шніп, Уладзімір Пецюкевіч — менавіта ён напісаў словы «Рэха жураўлінага». Можа, гэтыя творцы зніклі, з'ехалі куды, падаліся ў вырай? Дарэчы, якое ёмістае слова — **вырай**! На рускую мову перакладаецца ажно трыма словамі: «стая перелётных птиц». Увогуле наша мова вельмі эканомная. Вось глядзіце: «белый гриб» — **баравік**, «железная дорога» — **чыгунка**, «бумажная фабрика» — **паперня**, «кирпичный завод» — **цагельня**, «летучая мышь» — **кажан**, «чёрный дятел» — **жаўна**, «растительное масло» — **алей** і г.д. Спецыялісты сцвярджаюць, што па мілагучнасці беларуская мова на другім месцы ў Еўропе пасля італьянскай. А па эканомнасці, ёмістасці, мабыць, саступае толькі англійскай.

Дык вось, нашы паэты-песеннікі нікуды не зніклі. Яны працуюць! Алесь Бадак зараз галоўны рэдактар часопіса «Нёман», атрымаў нядаўна дыплом аб заканчэнні Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі, Віктар Шніп — галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура», Уладзімір Мазго — намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Полымя», жывыя, здаровыя іншыя майстры песеннага жанру. Але іх прозвішчы вы не пачуеце. Затое нейкага заезджага гастралёра тут жа запросяць на перадачу і аб'явяць... легендарным.

❑ ❑ ❑

Так, мы жывём у век татальнай дэвальвацыі. Абясцэньваюцца грошы, словы, сумленне, — дый чалавечае жыццё ўвогуле. І ўсё ж за справядлівасць трэба змагацца. За аднаўленне таго, што было нядаўна і раптам знікла. Напрыклад, зусім нядаўна штораніцы пасля гімна, кароткіх паведамленняў гучала праграма перадач радыё на цэлы дзень. Пасля 16 гадзін — праграма вячэрніх перадач. Гэта займала 5 хвілін, а чалавек мог сабе пазначыць, што варта паслухаць. Дык жа не. Сакрэт!

Часам бывае смешна: радыё рэкламуе перадачы БТ, а пра свае праграмы — маўчок. А праграмы бываюць цікавыя, і людзі на радыё працуюць таленавітыя, я амаль усіх адрозніваю па галасах. Хіба зблытаеш з кім галасы нястомнай Святланы Башылавай, Валянціны Стэльмах, Галіны Шаблінскай? Гэта — каралевы радыёэфіру. Амаль штодня можна пачуць: кожную суботу а дзявятай вечара ў беларускім эфіры гучыць спектакль радыётэатра... А што будзе ў наступную суботу, аб'яўяць толькі ў апошні дзень. З-за гэтага я прапусціў першую частку выдатнага спектакля «Тутэйшыя». Праўда, другую пашчасціла пачуць, як і гутарку з таленавітым купалаўцам Віктарам Манаевым, які нарэшце атрымаў даўно заслужанае званне народнага артыста. Ёсць на свеце справядлівасць!

❑ ❑ ❑

Дзіўныя метамарфозы адбыліся з радыйным аглядам прэсы. За савецкім часам штодня ў 9.00 перадавалі агляд газет. Я заўсёды выпісваў нямала, нават зараз сем-восем выданняў атрымліваю. Ну, хіба я магу не выпісаць «Звязду»? Родную газету на роднай мове. Менавіта па ёй давялося другі раз вучыць беларускую мову. Пасля службы на флоце, працы ў «Знамени юности», «Сельской газете», я моцна адвык ад усяго свайго. «Звязда» прыйшла на дапамогу. Хай даруе чытач газетны штамп — ужыты ён свядома.

Дык вось, бывала, пачуеш пра нейкі цікавы артыкул, кіруеш у шапік, каб набыць патрэбнае выданне. Упэўнены, так рабіў не толькі я. Потым агляд прэсы быў у перадачы «Радыёфакт». Памятаю, Антон Васюкевіч, адзін з цяперашніх кіраўнікоў радыё, басавітым голасам абвяшчаў: «А зараз караценька агляд прэсы». І доўжыўся той агляд нейкія пяць хвілін, а можа, і менш. Мяне здзіўляла: перадача ідзе цэлую гадзіну, агляд жа прэсы кароткі, як зайцаў хвосцік.

Нечая разумная галава таксама здзівілася, і агляд прэсы падоўжылі, нават пачалі перадаваць галасы журналістаў, якія апавядалі коратка пра сутнасць сваіх артыкулаў. Агляд перадавалі ўранні і па абедзе. Я радаваўся, але разумеў, што гэта складана, ці надоўга хопіць пораху. Як у ваду глядзеў: праз нейкі час радыёагляд прэсы знік зусім. Маўляў, шукайце ў інтэрнэце — там усё ёсць.

Але ж далёка не ўся Беларусь сядзіць у сеціве. А так за 7—8 хвілін усе даведваліся, пра што пішуць нашы перыядычныя выданні. Дарэчы, быў нядаўна ў Варшаве. Уключаю тэлевізар — у 6.45 «Поранні агляд прэсы». За некалькі хвілін я даведаўся пра галоўныя артыкулы польскіх газет. Не спяць у шапку тэлежурналісты суседняй дзяржавы.

❑ ❑ ❑

А цяпер пра выпадковую сустрэчу. Неяк у трамваі села побач сімпатычная русявая кабета сярэдняга ўзросту, дастала з сумкі кнігу і ўгледзелася ў яе. Краем вока ўбачыў на вокладцы прозвішча вядомай маскоўскай аўтаркі. Па даўняй журналісцкай звычцы не стрымаўся, каб не пачаць размову. Незнаёмка ахвотна адказала на мае пытанні. Так, сапраўды любіць чытаць у транспарце: ехаць далёка. Працуе бухгалтарам — аднастайная, нудная работа, а ў кнігах іншае жыццё, іншыя героі, цікавыя думкі, пачуцці.

— Беларускіх аўтараў, на жаль, не чытаю. Родам я з Салігорскага раёна, скончыла беларускую школу. Мову нашу люблю. А чаму не чытаю? Баюся расчаравання. Каб я ведала, што гэтая кніга вельмі цікавая, што яе трэба абавязкова прачытаць, то я б гэта зрабіла. А так нідзе ж не прачытаеш. Няма рэкламы. Няма раскруткі. А пра маскоўскую аўтарку я шмат чытала. Вось так у нас: чужых хвалім, пра сваіх маўчым.

Усё праўда. Міжволі падумалася: шараговы бухгалтар разумее тое, чаго не разумеюць ці не хочуць разумець выдаўцы, галоўныя рэдактары газет. Рэцэнзіі на новыя кнігі зусім зніклі з нашых выданняў. На адну з першых маіх кніжак — «Якар надзеі», якая ўбачыла свет у «Мастацкай літаратуры» ў 1979 годзе, было 9 рэцэнзій. І аўтары самыя розныя: ад пісьменнікаў Алеся Марціновіча, Ванкарэма Нікіфаровіча да знакамітага гісторыка Міколы Ермаловіча. Так, М. Ермаловіч у «Чырвонай змене» надрукаваў рэцэнзію на маю кнігу, далёкую ад гісторыі.

А вось прыклад з нашай явы. Неяк летась патэлефанаваў з Клецка Аляксандр Жукоўскі, сказаў, што вельмі яму спадабаўся мой раман «Палыновы вецер», узрушыла апісанне падзей 91-га года, ён усё гэта перажыў, таму напісаў грунтоўную рэцэнзію і адаслаў у адну з рэспубліканскіх газет. Мяне гэта ўсцешыла, бо ведаю, што Аляксандр Мікалаевіч — чалавек сур'ёзны, бывалы, як кажуць, з сямі печаў хлеб еў. Працаваў настаўнікам, дырэктарам школы, загадчыкам райана, намеснікам старшыні Клецкага райвыканкама па ідэалогіі. Некалі радыё ў рэпартажах з сесій абласнога Савета дэпутатаў перадавала яго выступленні — вядома, на роднай мове. Яго, як і старога вераб'я, на мякіне не падманеш.

Месяцы праз два званок з Клецка: «У рэдакцыі сказалі, што матэрыял надрукавалі ў сярэдзіне жніўня. Перагледзеў некалькі разоў падшыўку, матэрыялу не знайшоў. Што яны, здзекуюцца з мяне?» — «Папрасіце, каб назвалі канкрэтны нумар». Праз нейкі час званок: «Знайшоў. Маленечкая заметка. Рэдакцыя ўзяла два абзацы з рэцэнзіі. У першым — пра выхад цікавага рамана, у другім — у раённых кнігарнях няма беларускіх кніг, маўляў, іх слаба купляюць. А купляюць слаба, бо слаба прапагандуем».

Куды ўжо слабей! Вось гэта раскрутка і кнігі, і яе аўтара.

❑ ❑ ❑

Такім чынам, мае рацыю шараговы бухгалтар: пра сучасную беларускую літаратуру з газет не даведаешся. Не дазнаешся пра нашых знакамітых творцаў і з календара «Родны край» на 2011 год.

Нядаўна пайшоў з жыцця вялікі працаўнік і вялікі пісьменнік Янка Сіпакоў. Таленавіты паэт, празаік-філосаф, бліскучы эсэіст, выдатны перакладчык, а яшчэ й гумарыст які! Шмат гадоў працаваў у «Вожыку». Гартаю каляндар: як жа адзначылі яго 75-гадовы юбілей? А ніяк. Няма ні слова! А як адзначылі юбілей народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна? Таксама — ні слова! Быццам яго і няма. І не было. «Забыліся» выдаўцы календара і пра юбілеі іншых нашых знакамітых творцаў.

Парадоксы нашага часу.

А між тым, у людзей жыве цікавасць да беларускай кнігі, прага да роднага слова. На сустрэчах з чытачамі ў Радашковіцкай гарадской бібліятэцы, Ільянскай сярэдняй школе, што на Вілейшчыне, выказваліся прапановы юбілейны для Купалы і Коласа 2012 год аб'явіць Годам роднай мовы.

Гэта голас народа. І да яго варта прыслухацца.

❑ ❑ ❑

**Дзіўныя бываюць супадзенні. Зноў ранішні эфір. Зноў дзявочы галасок спявае «Затрымай мяне...». Зноў тэлефануюць радыёслухачы. Павел Лазовік называе гурт — «Аўра», а прозвішча салісткі, прозвішчы аўтараў тэксту і музыкі застаюцца ў сакрэце.**

**Леанід ЛЕВАНОВІЧ, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Івана Мележа, прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.**

---

## Сузор'е беларусаў свету

***Прыемна, што з'явіліся водгукі. Напрыклад, паэт Сяргей Панізнік вітае рубрыку вершам.***

### НАС МНОГА!

*«Нас многа». —*
*Я спадзеўна разважаю*
*пад зоркавым*
*намоленым жытлом.*
*Святлінкамі планіду акружаю.*
*Нас — многа!*
*Тут, пад небам, я мужаю*
*І памнажаю зрок яго святлом.*

*У забыцці —*
*разгуба і трывога,*
*зіркатыя зарніцы ў слепаце...*
*А тут, дзе Беларусі*
*ў небе многа, —*
*павернута жыццё ўпрытык*
*да Бога*
*І не відаць канца яму нідзе.*

***Ну, а мы працягваем.***

### ХВІСЮК Мікалай Іванавіч



**[1934, в. Варацэвічы Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл.]**

**Вучоны-медык, прафесар. Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Украіны.**

М. Хвісюк нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння сямігодкі паступіў у Пінскую фельчарска-акушэрскую школу, а ў 1953—1958 гг. вучыўся ў Віцебскім медыцынскім інстытуце, пасля чаго пачалася яго працоўная дзейнасць на пасадзе галоўнага ўрача санаторыя «Домрачава» на Брэстчыне. З 1963 г. вучыўся ў аспірантуры Харкаўскага інстытута ўдасканалення ўрачоў. Фактычна з гэтага часу яго лёс звязаны з Украінай. Працаваў асістэнтам кафедры траўматалогіі і артапедыі, дацэнтам, намеснікам дырэктара па навуцы Харкаўскага НДІ траўматалогіі і артапедыі ім. М. Сітэнкі, з 1977 г. — рэктар Харкаўскага інстытута ўдасканалення ўрачоў. Прафесар М. Хвісюк — вучоны з арыгінальнымі навуковымі поглядамі па многіх тэарэтычных і клінічных пытаннях траўматалогіі і артапедыі. Ён з'яўляецца заснавальнікам адной з буйных навуковых школ у галіне артапедыі пазваночніка (вертэбралогіі), ім распрацаваны шэраг новых навуковых напрамкаў па гэтай спецыяльнасці. М. Хвісюк з'яўляецца аўтарам 252 навуковых прац, у тым ліку 6 манаграфій і 52 вынаходніцтваў. Пад яго кіраўніцтвам абаронены 32 кандыдацкія і 5 доктарскіх дысертацый.

У 1995 г. прызначаны членам Бюро Паўночна-ўсходняга цэнтра НАН Украіны. Шмат гадоў быў намеснікам Харкаўскай абласной комплекснай праграмы «Здароўе», у 1996 г. зацверджаны саветнікам-экспертам Камісіі па радыяцыйнай абароне насельніцтва Украіны. У 1997 г. Міжнародным біяграфічным цэнтрам Кембрыджа (Англія), а ў 1998 г. Амерыканскім біяграфічным інстытутам прызнаны Чалавекам года за заслугі ў галіне медыцынскіх навук. На працягу 22 гадоў працуе рэктарам Харкаўскай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, загадвае там кафедрай.

За выдатныя навуковыя дасягненні ў развіцці актуальных праблем лячэння пазваночніка і суставаў М. Хвісюк узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1976), «Дружбы народаў» (1986), пачэснай адзнакай прэзідэнта Украіны (1996). З'яўляецца галоўным рэдактарам часопіса «Проблемы науки и образования», членам шматлікіх рэдкалегій медыцынскіх выданняў. Абраны правадзейным членам Інжынернай акадэміі Украіны, членам-карэспандэнтам Міжнароднай інжынернай акадэміі.

**Вядучыя рубрыкі Святлана КАРПУЧОК і Яраслаў МАЛЬДЗІС.**

